ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдаўніцтва—XV
№ 28 (4280)
Серада, 3 лютага
1932 г.

МЕНСК, Савецкая 37

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ.—Лесазагатоўкі пад асобны нагляд усёй рабочай клясы. — П. Андроўскі — Падзеі на Далёкім Усходзе. (4 стар.).

ГРЫНЕВІЧ — За 86 тыс. тон таварнага малака (3 стар.).

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя — даклад т. Арджанікідзэ. Спрэчкі па дакладу — прамовы т. т. Постышава і Мікаяна, — Хроніка канфэрэнцыі (1 стар.).

XIV зьезд КП(б)Б — даклад тав. Грысевіча аб выніках работы прамысловасьці за 1931 г. і перспэктывах на 1932 г. (2 стар.).

Не на словах, а на справе рыхтавацца да дзкадніку генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы. Лютаў вырашае посьпех ільназагатовак. Слабая працдысцыпліна зрывае работу абменных пунктаў і таварных станцый (3 стар.).

КІТАЙ.—Бамбардыроўка Нанкіну і Сватоу японскім флётам (4 стар.).

Лесазагатоўкі—пад асобны нагляд усёй рабочай клясы

Лесазагатоўкі зьяўляюцца адным з важнейшых участкаў народна-гаспадарчага плану. З выкананьнем заданьняў па лесазагатоўках непарыўна зьвязана вырашэньне раду кардынальных задач, што стаяць перад намі ў заключным годзе пяцігодкі. Зразумела роля лесу, як валюты, у справе тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, у справе барацьбы за эканамічную незалежнасьць Савецкага Саюзу. Зразумела роля лесу ў прамысловым і жыльлёвым будаўніцтве, у вырабе шматлікіх прадметаў рабочага спажываньня. Лес — адзін з асноўных відаў сялу.

Усё гэта ставіць барацьбу за лес, барацьбу за поўнае выкананьне плану лесазагатовак у лік баявых, неадкладных задач партыі і рабочай клясы. Асабліва важнае значэньне гэта пытаньне набывае на ўмовах БССР, як аднаго з раёнаў Савецкага Саюзу, з багатай лясной гаспадаркай і шырока разьвітай дрэваапрацоўчай прамысловасьцю.

У якім-жа становішчы знаходзіцца выкананьне плану лесазагатовак у БССР? Студзеньскія вынікі гавораць аб яўна нездавальняючым стане гэтай справы.

У першым квартале бягучага году трэба загатовіць 1.978 тысяч кубаметраў дзелавой драўніны і 2.341.220 рамэтраў дроў. Заданьне на вывазцы здзейснена складае 3.461 тыс. кубаметраў і 3.056 тыс. рамэтраў.

За першыя дзьве дэкады студзеня дзелавой драўніны загатоўлена 22,7 проц. і вывезена 8,2 проц. плану, па дровах — загатоўлена 21,8 проц., вывезена 15,1 проц. плану. Гэтыя лічбы сьвядчаць аб сур'ёзнай перасьлядзе для лесазагатоўчых арганізацый.

Дзе ляжаць карэньні такога недазадавальняючага выкананьня плану загатоўкі і вывазкі лесу?

Перш за ўсё ў буйных недахопах работы лесапрамысловых арганізацый, у недапушчальна слабой перабудове ўсёй работы на аснове **6 умоў тав. Сталіна.**

Лесазагатоўчымі арганізацыямі ня было праведзена неабходнай манэўранасьці ў сувязі з атмасфэрнымі зьменамі, якія адбываліся ў апошні перыяд часу. Лесазагатоўчыкі аказаліся надолькі ў свой час хутка перабудаваць на вывазку леса на калёсах. Горш таго, у разе месц пасаванае санная дарога выклікала яўна дэмабілізацыйныя настрої.

З надобнага году апартуністычнымі тэндэнцыямі знайсьці «апраўданьні» ў «аб'ектыўных прычынах» неабходна павесьці самую жорсткую барацьбу. Трэба цьвёрда ўсьвядомець, што плян лесазагатовак можа і павінен быць цалкам выкананы, перамагаючы труднасьці, якія сустракаюцца.

На мэнш буйным недахопам у рабоце загатоўшчыкаў зьяўляецца яшчэ меншае па-бальшавіцку ператварэньне у жыцьцё ўказаньне т. **Сталіна** аб арганізаваным наборы рабочай сілы. У гэтай галіне зроблена яшчэ вельмі мала, у большай ступені тут пануе самацёк. Так, на 15 сьнежня Лесбелам па дагаварах завербавана было замест 27.732 неабходных лесарубаў усяго толькі 3.726 чалавек, па фурманках замест 25.089 толькі 964. Выкананьне заключаных дагавораў ідзе не правяраецца.

У гэтай-жа сувязі трэба закрануць пытаньне аб недаацэнцы гаспадарча-палітычнага значэньня лесазагатовак рядам калгасных арганізацый. Даволі ўказаць, што замест 65 тысяч фурманак, якія павінны штодзённа працаваць на лесазагатоўках, працуе толькі 18.200. Ёсьць шматлікія выпадкі парушэньня дырэктыў партыі ў галіне разьліку з калгасьнікамі па загатоўцы і вывазцы лесу. Трэба незадзіцна спыніць усялякі адлічэньні з калгасьнікаў за работу па лесазагатоўках без кана, не дапускаць адлічэньняў звыш 3 проц. на лесавывазцы пры рабоце на калгасным кані са сваімі кармамі і ня звыш 25 проц. пры рабоце на калгасным кані з калгаснымі кармамі. Разьлік з калгаснікамі павінен праводзіцца непасрэдна лесапрамгасамі. Разьлік праз праўленьні калгасаў трэба катэгарычна спыніць.

Буйнейшым недахопам работы на лесазагатоўках застаецца вельмі слабая ўвага арганізацый працы ў разрэзе месц. Брыгадны мэтад, як асноўная форма работы, ажыцьцяўляецца абураюча марудна. Пастанова ЦК КП(б)Б аб пераводзе на брыгадны мэтад да канца 1931 г. ня менш 75 проц. рабочых засталася невыкананай. У брыгадах аб'яднана толькі каля 40 проц. занятой на загатоўках рабочай сілы. Надзвычай мала яшчэ зроблена па лініі мэханізацыі лесазагатовак. Але што асабліва недапушчальна, гэта абураючыя недахопы ў эксплёатацыі наяўных мэханізмаў, факты барбарскіх да іх адносін, яшчэ нелікідаваная абязьлічка, а адсюль частыя выпадкі мэханізмаў са строю. Вельмі паказальна ў гэтых адносінах зьменчаная гэтымі днямі ў «Зьвязьдзе» карэспандэнцыя аб тым, што ў Рэчыцкім лесапрамгасе з-за елачыннага выкарыстаньня мэханізмаў кубамэтр дроў, выпрацаваны маторнай сілай, абышоўся ў 20 руб., а ручным спосабам — у 1 р. 25 к. Трэба рашуча палепшыць арганізацыю працы на лесазагатоўках, масавымальна выкарыстаць усе магчымасьці мэханізацыі працы, поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку ў карыстаньні мэханізмамі.

Сярод прамрыемстваў, якія забясьпечваюць посьпех лесазагатовак, трэба з усёй сілай падкрэсьліць задачу карэннага палепшэньня работы лясных наапэрацыйных органаў. Лесарабоны да гэтага часу працуюць запала дрэнна, не прыстасавалися да ўмоў бесьперабойнага спабжэньня рабочых, занятых на лесараспрацоўках. Нярэдкія выпадкі выкарыстаньня не па прызначэньні і нават разбазаваньня фондаў прамтавараў і прадуктаў, прызначаных для лесазагатовак.

Адзін з важнейшых прадпасылак, якія забясьпечваць посьпех лесазагатовак, зьяўляецца шырокая арганізацыйна-масавая работа, разьвіцьцё сацыялістычнага і ўдарніцтва, штодзённае растлумачэньне калгаснікам і бядняцка-сераднятцкім масам адпаасобнікаў вялізарнага значэньня сваячкоства і поўнага выкананьня лесазагатоўчых плянаў. Між тым, гэта работа часта недаацэньваецца, падмяняецца голым адміністраваньнем. У Заслаўскім раёне калічыні непатрэбным арганізаваць штаб сядзейнасьці лесазагатоўкам і вывазцы, якія існуюць ва ўсіх раёнах загатовак, а вылучыць асобна ўдаўнаважанага з функцыямі, паводле слоў старшыні РВК, «накручваць усе арганізацыі». Ня дзіва, што пры такой рабоце квартальны плян вывазкі лесу ў раёне выкананы за 20 дзён студзеня на 3,3 проц.

Непадрэнка масавай работы, мэтады адміністраваньня ў адносінах калгасьнікаў, бедняцкай і сераднятцкай — адпаасобнікаў перапляцаюцца ў некаторых мясцох з аслабленьнем націску на кулацка - заможныя гаспадаркі. Прыкладам прадпартуністычнай практыкі можа служыць Кармянскі раён, дзе ў Рудзянскім сельсавеце 14 кулацка-заможных гаспадарак яшчэ ня вывезьлі ні аднаго бервяна. Такое-ж становішча ў Курчынскім і Літвінаўскім сельсаветах. Ня выкананы цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі ў Заслаўскім, Крычаўскім і інш. раёнах. Патрэбна рашучая барацьба з надобнага роду зьявішчамі. **Выкананьне цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі павінна быць узята пад строгі кантроль мясцовых арганізацый.**

Буйнейшыя недахопы ў рабоце па лесазагатоўках пельга ня зьвязаць са слабай пастаноўкай партыйнай і прафесіянальнай работы на лесазагатоўках, з невыстарчальным паваротам яе да ніжэйшага выпадкага сына. У гэтым сьвятле набывае выключна важнае значэньне хуткае ажыцьцяўленьне пастановы **ЦК КП(б)Б** аб арганізацыі на працяту першай паловы лютага **самастойных парт'ячэк пры ўсіх лесапрамгасах і буйных прарабаўскіх вучастках,** а таксама ў вылучэньні ў рашаючых лесазагатоўчых раёнах **спэцыяльных партарганізатараў.**

Адказныя задачы, якія стаяць у сувязі з загатоўкамі, патрабуюць узмацненьня ўвагі гэтаму вучастку работы з боку ўсіх партыйных, савецкіх, гаспадарчых, прафесыянальных і камсамольскіх арганізацый.

Тэмпы работы трэба ўдзесяцярыць. **Зноў устаноўленая санная дарога дазваляе максымальна павялічыць вывазку лесу.** Патрэбна цвёрасьць, штодзённая катоўнасьць перабудавацца на работу на калёсах.

Шырэй ударніцтва на лесазагатоўках! Мможыць пачынаньне перадавых калгасаў, прынявўшых перад XIV зьездам КП(б)Б канкрэтныя абавязацельствы па загатоўцы і вывазцы лесу! Прыклад калгасаў Нараўлянскага раёну, калгасу «Вострая карма» і інш., адозвы якіх апублікаваны гэтымі днямі ў «Зьвязьдзе», **павінен знайсьці шырэйшыя водгукі па ўсёй БССР.**

Дні работ XVII канфэрэнцыі ўсеКП(б) павінны стаць днямі карэннага пералому ў ходзе лесазагатовак.

Змагаючыся з правымі, «левымі» апартуністамі і прымірэнцамі, разьвіваючы ўдарніцтва на лесараспрацоўках, ажыцьцяўляючы 6 умоў т. Сталіна, мы выканаем поўнасьцю плян лесазагатовак, забясьпечым гэтым адну з важнейшых прадпасылак пераможнага выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Баявое, неадкладнае заданьне

сім сакратаром райкомаў КП(б)Б, старшыням РВК і дырэктарам лесапрамгасаў

Невыкананьне студзеньскага пляну лесавывазкі пагражае зрывам заданьня першага кварталу — рашаючага для выкананьня гадавой праграмы.

У сувязі з устанаўленьнем санных дарогі ЦК КП(б)Б і СНК БССР катэгарычна прапануюць напрэчыць усе сілы для ўзмоцненай вывазкі лесу. Зараз-жа мабілізуйце ўсе партыйныя сілы рэйну для работы на вёсцы і ў лесе, падпарадкуйце працу ўсіх савецкіх, прафсаюзных, кааперацыйных і грамадзкіх арганізацый выкананьню плянаў вывазкі лесоматар'ялаў.

ЦК КП(б)Б ІВАНОЎ.
СНК БЭНЗК.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя

Даклад тав. Арджанікідзэ

На зачэрпнім пасяджэньні 30 студзеня з дакладам «Вынікі разьвіцьця прамысловасьці за 1931 год і задачы 1932 году» выступіў тав. Арджанікідзэ, спатканы гучнымі апляўдысмэнтамі.

— 1931 год, — гаворыць тав. Арджанікідзэ, — скончыўся перамогай нашай прамысловасьці. Прадукцыя яе склала 27 млрд. руб. Прырост супроць мінулага году на 21 проц. У тым ліку пажчкая прамысловасьць дала прадукцыі на 11 млрд. руб., прырост — 28 проц., лёгкая — 7,6 млрд. руб. — 12,6 проц., харчовая — 2,5 млрд. руб. — 12,6 проц., прамысловасьць Наркамснабу — 6 млрд руб. — 22,5 проц.

Пасобныя галіны паказалі цуды выключны рост. Так, прадукцыя аўтатрактарнай прамысловасьці склала 221 проц. у параўнаньні з папярэднім годам. «Сталькмост» — 186 проц., тэхніка бясьпекі — 186 проц., запчастаабудаўніцтва — 173 проц.

Некаторыя галіны выканалі пяцігодку за тры гады. Машынабудаўніцтва, электратэхнічная прамысловасьць, нафтавая, гумавая, шэлюгабудаўніцтва перавысілі ў 1931 годзе ўзровень вытворчасьці, які намячаўся пятігадовым плянам на апошні год пяцігодкі.

Капітальныя ўкладаньні ў 1931 годзе склалі ацэнку пігадзкую лічбу—7 млрд. руб. — больш, чым за пазярэдняя 2¼ гады. Уведзен у эксплёатацыю асноўны капітал у 3,5 млрд. руб.

Нязўхільны і бурны рост нашай сацыялістычнай прамысловасьці адбываецца на фоне вялізарнейшага пацаньня вытворчасьці на ўсім капіталістычным сьвеце. Мы маем гадавы прырост у 21 проц. і зусім заканна лічым, што гэтага мала. Але ніколі, нават у самыя лепшыя часы, ні адна капіталістычная краіна ня ведала такога процэнту прыросту вытворчасьці за адзін год. Нават Амэрыка ня мела гадавога прыросту больш за 7 проц. А цяпер прамысловасьць капіталістычных краін ідзе ўніз з такой шыпкасьцю, в якой зна ніколі, балай, ня ішла ўперш. Калі ўзровень 1925 году прыняць за 100 проц., дык узровень вытворчасьці 1931 году складае ў Германіі 81 проц., у Англіі — 93, у Амэрыцы — 68,5, а ва ўсіх капіталістычных краінах разам узятых — 82 проц. А ў нашай краіне? Супроць 100 у 1925 годзе наша прамысловасьць узьнялася праз год да 127, потым — да 147, далей да 170, яшчэ праз год — да 198 і ў 1931 годзе — да 219 проц.

Посьпех вялізарны. Але ці значыць гэта, што лёзунг Ільіча: «Дагнаць і перагнаць» мы ўжо ажыцьцявілі? Вядома, не. Нізкагодовай аўтазавод, харкаўскі трактарны, маскоўскі аўтазавод, Уралмашбуд (першая чарга), саратаўскі камбайны, завод фрэзэрных варштатаў у Нізкім, завод рэвальверных варштатаў у Маскве, «Калібр», «Фрэзэр», Уральскі медэшчалічны камбінат. За пяцігодным коцам створан прамысловы центр Хібінагорск, дзе распрацоўваюцца апатыты. Пускаецца Кузьнецкі мэталюргічны завод. Сёньня запалена першая домна сусьветнага гіганта — Магнітагорскага заводу. Пускаецца першая чарга Варэзьнікаў, шэфскі і васкрасенскі хімкамбінаты, «Парыкопадшыпнік». Здана ў эксплёатацыю 79 каналоў. Набудаваны электрастанцыі агульнай магутнасьцю ў 1 млн. квт

Але мала набудаваць і здаць у эксплёатацыю. Трэба было паставіць на службу нашай дзяржаве, нашым мэтам гэту першаклясную магутную тэхніку. Тав. Сталін год назад з усёй рэзкасьцю паставіў перад усімі намі пытаньне аб адпаведным тэхнічным. З таго часу мы такіх-сякіх посьпехаў у гэтай справе дасягнулі.

Наглядны прыклад гэтага — сталінградзкі завод. Колькі разважаньняў было, што: «не аўладаюць». Вядома, нам прылялася пазавіцца. — Але зараз ужо ўсе батаць, што на сталінградзкім заводзе справа наладжана моцна. Яшчэ ня так даўно ён выпускаў трактары з вялікімі перабоямі, а зараз з дня ў дзень дае больш 120 машын і сёньня даў 180. На заводзе зараз дыскусуецца пытаньне: ці зьвяўляцца кампляксай праектная магутнасьць заводу ў 144 трактары ў дзень? Ня сумняваюся, што ў сакавіку-красавіку сталінградцы дасягнуць гэтага ўзроўню. Але ці кампляксная гэта? Разам з дыскусуючымі таварышамі думаю і пераконан, што для бальшавікоў, для ўдарнікаў гэта лічба — не кампляксная. Ёсьць усе магчымасьці даць больш і я ўпэўнен, што сталінградцы спокуць даць 200 трактараў у дзень.

Урокі Сталінграду не прайшлі даремна. Харкаўскі трактарны адразу пайшоў плаўна наперад і зараз дае ўжо 50 трактараў у дзень.

Вопыт пуску новых заводаў у 1931 годзе дапаможа нам у гэтай справе ў 1932 годзе. Гэты вопыт паказвае, што мы з любым заводам справімся. Нашымі «расійскімі» рабочымі, нашымі інжынэрамі і тэхнікамі мы ставім і паставім амэрыканскую тэхніку на службу сацыялізму.

Прайшоўшы год характэрны шырокім разгортваньнем машынабудаўніцтва. Вялізарных посьпехаў мы дабіліся ў с.-г. машынабудаўніцтве. Многія адказныя машыны мы выпускаем ужо дзесяткамі тысяч. Паравозы, цыстэрны, вялікагрузныя вагоны, машыны для электрычнай прамысловасьці вялізарных магутнасьцяй і славейшых канструкцый, паравыя турбіны, абагачальнае абсталяваньне, блюмінгі, разьлічальныя машыны, крэйцы, трубчаткі — усё гэта мы навучыліся будаваць сваімі рукамі на нашых заводах з саветскі матар'ялаў. Аўладаем вэрштатабудаўніцтвам. У 1931 годзе набудавана 16.000 варштатаў супроць 7.000 у 1930 годзе. У шырокім маштабе прыступілі да вырабу інструментаў.

Слаба ў нас з кармамі. Праўда, і на гэтым вучастку мы далёка пасунулися наперад. У 1931 годзе з навучальных устаноў выпусьцілі 21.000 інжынэраў і тэхнікаў. У 1932 годзе выпусьцім 38.000. Але гэтага мала.

Мацнець і растуць навукова-дасьледчыя інстытуты. У 1930 годзе іх было 141, зараз — 255. Лік навуковых работнікаў у прамысловасьці ўзрос з 6.000 да 12.500. Але трэба адзначыць слабасьць сувязі інстытутаў са штодзённай практычнай прамысловасьцю. На адлегі з шырэй прафэсар-хімік Юшкевіч гаварыў, што ўжо час арганізаваць манастырскія сьцены нашых інстытутаў і апынуцца ў жывую практыку прамысловасьці.

З-за мэнастырскіх сьцен інстытутаў — на заводы. Гэты лёзунг выклікаў сустрэчнасьці некаторых прафэсароў: як бы нашуба не адстала? Зразумэлая справа, нашуба не павінна адставаць, і яна ня будзе адставаць у нас. Але ўсім мае рацыю прафэсар Юшкевіч, калі ён заклікае спалучыць навуку з штодзённай прамысловай практыкай. Ад гэтага выіграе ня толькі прамысловасьць, але і навука.

Побач з ростам прамысловасьці расьце пралетарыят у нашай краіне і паляпшэньне яго становішча. За мінулы год лік рабочых і служачых у прамысловасьці ўзрос на 442 тыс. чалавек. Беспрацоўе поўнасьцю ліквідавана. Заработная плата па прамысловасьці ВСНГ узрасла за 11 месяцаў на 16 проц. У галіне тарыфнай сыстэмы ў нас былі зьявіцца недахопы, якія яшчэ ня зусім выпраўлены і зараз. Слаўтая ўрэгулёўка яшчэ ня ўсюды ліквідавана. Па ўзроўні зарплаты да 4 квартылу 1930 году мэталісты сталі на 11 месяцы спрэд іншых прафэсій, чугуналіцьнікі — на 19, каксавікі — на 27. Рабочыя лёгкай прамысловасьці былі ў больш сарыяючым становішчы, чым рабочыя гэтых важнейшых і другарадных па ўмовах працы галін прамысловасьці. Трэба як можна хутчэй дарабіць пачатае, як можна хутчэй пакончыць з гэтай зусім небальшавіцкай тарыфнай палітыкай.

Расьце жыцьлёвы фонд, з кожным годам павялічваюцца ўкладаньні ў жыльлёўдаўніцтва. У 1929 годзе мы ўклалі 175 млн. руб., у наступным годзе —300 млн. руб., у 1931 годзе—470 млн. руб.

Часта чуцны скаргі: не хапае прадметаў шырокага спажываньня.

Зусім правільна: моцна не хапае. І ўсё-ж такі ў вырабе гэтых прадметаў мы далёка апераваліся нагнаў і параўнальні з даваенным. Калёны: у 1913 годзе ў Расіі іх было выпушчана 27 млн. пар, у 1931 — 58,9 млн. пар. Абутак: у 1913 годзе — 8,4 млн. пар, у 1931 годзе — 76,8 млн. пар. Мыла гаспадарчае: у 1913 годзе — 94 тыс. тон, у 1931 годзе — 181 тыс. тон. У чым-жа справа? Справа ў тым, што да рэвалюцыі пераважная пераважная насельніцтва хадзіла абутаю і мылася мылам, а мільёны былі босыя, або абутыя ў лапці і хадзілі брудныя. Гігантскі вырасла патрэбнасьць — вось у чым справа. Наша задача — задаволіць гэтую патрэбнасьць. Што перашкаджае нам? Недахват сыраду. І калі сельская гаспадарка настойліва патрабуе ад нас машын і мы даем гэтыя машыны, дык цэлер прыпоў час ад сельскай гаспадаркі патрабаваць сырац і яна павінна даць яго.

Ад часу XIV зьезду нашай партыі, які даў лёзунг індустрыялізацыі краіны, прайшло 6 год. Як мы выкананем гэты лёзунг, што стаў цэнтральным лёзунгам нашага будаўніцтва? Вазьмеце каменны вугаль: у 1925 г. было здабыта 17 млн. тон, у 1931 годзе — 57 млн. тон. Торф: 2,5 млн. тон і 9,5 млн. тон. Чыгун: 1,5 млн. тон, і 4,9 млн. тон. Машынабудаўніцтва: 730 млн. руб. і 5.578 млн. руб. Лёзунг індустрыялізацыі выкананецца бальшавіцкімі тэмпамі.

XVI зьезд партыі даўторы гады назад высунуў задачу стварэньня Урала-Кузбасу. І там, дзе паўтары гады таму назад было пустое месца, цяпер вырасьлі гігантскія заводы: Кузьнецкі, Магнітагорскі, Уралмашбуд, завод фэрасплываў. Вось адказ на пастанову XVI зьезду.

Каб ажыцьцявіць грандыёзную праграму будаўніцтва, шартыі трэба было адстаяць сваю генэральную лінію супроць трацкістаў, зіноўсьцяў і правых апартуністаў, перамагчы вялізарны друдасьці. Тав. Сталін у гэтай барацьбе быў нашым правадыром.

Ня гледзячы на посьпехі, мы пляну мінулага году ўсё-ж ня выканалі. Прычыны? Падвёў транспарт. Перашкаджала ўрэгулёўка. Ня было належнай увагі і асабліва з боку дзяржаўнага арганізацыі працы. Перашкаджала прамозгасьць аб'яднаньняў. Ня было сапраўднага гаспадарчага разьліку. Ня было належнай праверкі выкананьня нашых дырэктыў.

Барацьба з усімі гэтымі недахватамі павінна весьціся і далей з усёй рашучасьцю. Без выкананьня іх цяжка будзе справіцца з плянам гэтага году. Вялікачные гэтых недахопаў дае вялізарныя результаты. Вазьмеце той-жа Сталінградзкі завод. Там добра паправаў над усімі гэтымі пытаньнямі і ў результаце мы маем ня толькі рашучы ўздым вытворчасьці, але і рэзкае вялізнае сабекошту. Сабекошт сталінградзкага трактара ў студзені 1931 году складаў 5.793 руб., у сьнежні 1931 году — 3.328 руб.

Зьнізілі сабекошт машынабудаўніцтва, электратэхнічная прамысловасьць, нафтавая. Рэзка павысілі: лясная, чорная мэталюргія, торф, шуталь. Гэтыя галіны яшчэ ёсьць выбуджаныя другіх галін. Так працаваць далей нельга. На працяту першай пяцігодкі прамысловасьць сыстэматычна атрымлівала дапамогу ад іншых галін народнай гаспадаркі. У другой пяцігодкі прамысловасьць павінна ўкласьці свой уклад у агульныя народна-гаспадарчыя накапленьні.

Задачы 1932 году вялізарныя. Самацёкам яны выкананы ня будуць. Прамысловасьць павінна даць прырост у 36 проц. Цэнтральная задача: выкананьне праграмы на чорнай мэталюргіі, на цуталі і на машынабудаўніцтве. Асабліва цяжка ў нас з мэталюргіяй. У 1931 годзе мы не прасунуліся наперад, засталися на ўзроўні папярэдняга году. Транспартныя затрудненьні пут выявіліся з асаблівай сілай. Але ня мешцы ўплыў зрабіў недахват кадраў. У нас ёсьць дасягальныя маладыя работнікі, але яны яшчэ ня маюць патрэбнай практыкі. Толькі цяпер, калі партыя так блізка зазірнула пытаньням чорнай мэталюргіі, мы бачым пачатак узьдыму. Учора на Саюзе выплаўлена 17 тыс. тон чыгуну. Такой колькасьці наша мэталюргія яшчэ ніколі не давала. Праграма ў 9 млн. тон чыгуну, ня толькі можа быць выкананая, але і перавыкананая. Заводы высунулі сустрэчны плян ў 10 млн. тон.

Мы разгарнулі вялізарнае капітальнае будаўніцтва ў галіне чорнай мэталюргіі, разьмеры якога ня ўсе ясна ўяўляюць. Усе ведаюць, што мы будуем два гігантскіх мэталюргічных заводы—Магнітагорскі і Кузьнецкі. Але побач з гэтым, мы вядзем рэканструкцыю існуючых прадпрыемстваў. Магутнасьць Макеўскага з 230 тыс. тон даваеннага, мы павялічылі да 402 тыс. і ў гэтым годзе павялічым да 640 тыс. тон. А пасьля закончэньня рэканструкцыі Макеўскі завод будзе даваць 1.500 тыс. тон. Завод імя Дзяржынскага зараз дае 500 тыс. тон, а пасьля рэканструкцыі будзе даваць 1,800 тыс. тон. Варашыльаўскі завод—275 тыс. і 1.000 тыс. тон. Гэта ўжо не рэканструкцыя, а па сутнасьці справы пабудова новых гігантскіх прадпрыемстваў.

У 1931 годзе пайшлі ўступіць у строй 24 доменных печы, 68 мартэнаў, 7 электрапечаў, 28 пражатных варштатаў, у тым ліку 7 блюмінгаў.

Вы бачыце, якія моцныя падмацаваньні мы пускаем у ход. Ці можна выканаць праграму ў 9-10 млн. тон чыгуну ў 1932 годзе? Можна і трэба. Уся партыя і ўся рабочая клясы, уся краіна павінны змагацца за выкананьне гэтай праграмы, і калі мы яе выканаем, мы займем адно з першых месц ва ўсім сьвеце.

Разьвіваць мэталюргію пельга без разьвіцьця вугальнай прамысловасьці. Ня гледзячы на зрух у Данбасе і іншых басэйнах, вугалю мы даем усё-ж мала і вугаль па зольнасьці серкі значна вышэй нормы. Трэба націсьнуць і па якасьць і на колькасьць. Ва што-б там ні стала даць у 1932 годзе 90 млн. тон вугалю. Шлях да гэтага —фарсаванай мэханізацыя капаленьь. Мэханізаваная адабыча ў 1931 годзе дасягнула 56 проц. у адносінах да агульнай здабычы, у 1932 годзе мы павінны яе ўзьвесьці да 72 проц., а па Данбасе — да 81 проц. Мы моцна павялічваем машынны парк і павінны нырока застасаваць новыя мэтады здабычы вугалю. Новы спосаб навалкі, так званы «тупны нос», як пераладжае тварышы, поўнасьцю вырашае праблему мэханізацыі навалкі. Гэта значыць, што мы маем магчымасьць выказаць 25-30 тыс. рабочых для іншых работ.

Зараз у нас запаходзіцца ў праходцы 380 каналень. У 1932 годзе мы павінны заблісьнечыць здачу ў эксплёатацыю 89 каналень.

Заклікаць на службу народнай гаспадарцы іншыя віды палёву. Павялічыць здабычу торфу да 14 млн. тон, толькі з тэй абавязковай умовай, каб гэта быў сапраўдны торф, а не зямля з вадой, як гэта было ў мінулым годзе.

Разгарнуць распрацоўку сланцоў.

Павялічыць здабычу нафты да 27 млн. тон, арганізаваць вывяз нафты з Баку і Грознага.

Машынабудаўніцтва. Тут ляжыць галоўная лінія нашай работы за незалежнасьць. Неабходна фарсаваць будаўніцтва краматорскага і ўральскага заводаў цяжкага машына-будаўніцтва. Гэтыя заводы для чорнай мэталюргіі маюць такое-ж значэньне, якое для сельскай гаспадаркі маюць Сталінградзкі і Харкаўскі трактарныя заводы. Яшчэ шырэй разгарнуць буладаўніцтва машын, для электрыфікацыі, катлатурбін, нафтавага абсталяваньня, абсталяваньня для каляровай мэталюргіі, машын для камунальнай гаспадаркі, машын для камунальнай гаспадаркі, для лёгкай прамысловасьці. Пачаць будаўніцтва двух новых суднабудаўнічых заводаў.

Энэргетыка. У гэтым годзе павінны ўступіць у строй некалькі гігантскіх электрастанцый: Дняпроўская, Сьвірская, Рыбінская, Дзорагес і рад буйнейшых заводзкіх станцый. Пачнем будаваць гідрастанцыі і на Волзе і некалькі цэнтраль.

Усесьці ў строй рад новых заводаў каляровай мэталюргіі. Пачаць распрацоўку радкіх мэталяў. Ва што-б там ні стала знайсьці месцаразьмяшчэньне воднава і пачаць яго выраб.

Цэнтральная задача ў галіне хімічнай прамысловасьці — аўладаць тэхнаналёгічным працэсам на новых буйных прадпрыемствах. У гэтых адносінах мы купляем на ўсе поці. Апрача іншых хімічных прадпрыемстваў у гэтым годзе мы павінны закончыць і пусьціць 5 заводаў сынтэтычнага каўчуку. Гэта будзе нашай вялізарнейшай перамогай ва ўмацаваньні незалежнасьці.

Ва ўмовах недахвату мэталю і інш. матар'ялаў вялізарнае значэньне мае эканомія іх. Аб эканоміі ў нас думаюць вельмі мала. Вазьмеце паравозы. Каб набудаваць паравоз у 95½ тон вагою ХПЗ траціць 117 тон мэталю, Каломенскі — 125, Бранскі — 127, Луганскі — 130. З мэталем у нас абыходзяцца агідна. На адзінку вырабу мы трацім мэталю значна больш, чым любая іншая краіна. Барацьбу за эканомію мэталю трэба павесьці з усёй рашучасьцю.

Цэнтральнае пытаньне для усіх галін — арганізацыя працы. Гэту праблему мы павінны вырашыць у бліжэйшы годзе са што-б там ні стала.

Праграма 1932 году ня лёгкая. Але хто сказаў, што набудаваць сацыялізм, дык яшчэ ў адсталай краіне, лёгка?

Партыя Леніна, пад кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК і тав. Сталіна, бяз сумненьня закончыць выкананьне першай пяцігодкі ў 1932 годзе. **(Бурныя воплескі).**

Спрэчкі па дакладу т. Арджанікідзэ

Прамова тав. Постышава

Спатканы працяжнымі апляўдысмэнтамі тав. Постышаў гаворыць:

— Лепшы палёт вялізарнага значэньня 6 умоў тав. Сталіна — перапом, створаны ў другой палове 1931 году ў Данбасе, на Сталінградзкім трактарным і ў радзе іншых месц.

Як уяўляе ў нас за ажыцьцяўленьне пасьці ўмоў тав. Сталіна? Трэба сказаць, што гэта работа разгорнута далёка больш за ўсё з боку растлумачэньня.

Нашы гаспадарчыя арганізацыі ўзяліся за ажыцьцяўленьне 6 умоў перавална толькі з аднаго боку — **перабудовы заработнай платы.** Вядома, гэта вельмі вялікае пытаньне. Але аднаго гэтага не даволі. Шэсьць умоў тав. Сталіна неаддзучны адна ад адзнай. Ізаляваць пытаньні перабудовы заработнай платы ад астатніх умоў нельга; ізаляваць — гэта значыць даць шляпоўнакаштоўныя результаты; ізаляваць — гэта значыць не забіцца патрэбнага павышэньня прадукцыйнасьці працы на аснове гэтай перабудовы заработнай платы.

Але нават пытаньне аб перабудове заработнай платы мы яшчэ глыбока не захапілі; многія скажэньні і недахопы на гэтым вучастку яшчэ ня выкрыты, яшчэ жывучы і прыводзяць да рэзка адмоўных результатаў. Усё-ж мы ўжо зараз пры ўсёй нязкончанасьці гэтай работы маем надзвычай станоўчыя результаты ў справе перабудовы зарплаты на радзе прадпрыемстваў.

Тав. Постышаў прыводзіць рад яркіх прыкладаў результатыўнасьці перабудовы зарплаты ў мартэнаўскіх цэхах заводаў імя Пятроўскага, імя Дзяржынскага і на каналёнах Данбасу.

Грапічная канкрэтнасьць прыкладаў, пакуль результатыў перабудовы, як яны адбіліся на заработку і прадукцыйнасьці працы пасобных рабочых, якіх тав. Постышаў называе, зрабіці асабліва пераканаўчай і яркай яго прамову.

На 9-ці абсьледаваных каналёнах Данбасу пасьля ўвядзеньня тарыфнай рэформы рост прадукцыйнасьці **забойчыка** выяўляецца ў наступных лічбах:

перасень — 85 тон,
кастрычнік — 99 тон,
сьнежань — 103 тоны.

Адбойшчык: перасень — 124 тоны, кастрычнік — 157, сьнежань — 185 тон.

Узмацнілася выкананьне на работу. Калі на Горлаўскім рудаўпраўленьне да тарыфнай рэформы рабочы даваў у сярэднім 16 выхадаў, то пасьля рэформы ён стаў даваць 18 выхадаў у месяц.

Пагізіўся працэнт, узьнялася зарплата, і зноў: канкрэтныя цэхі, канкрэтныя жывыя людзі. Крэпільшчык **Чарнышаў** выконваў да рэформы 112 проц. нормы і заработак вагаўняўся ў 4 руб. 20 к. на ўпражку, у сьнежні — 141 проц. нормы, заработак — 6 руб. 77 кап. Старшыня стаханаўскіх другіх печак на заводзе імя Пятроўскага ў 3-м квартале зарабляў 168 руб. у месяц, у 4-м квартале — 233 руб.

За прастоі на віне рабочага не плацілі, — так было пастаўлена пытаньне пастановай ВСНГ і УсеЦСПС. І гэта было мерапрыемствам цалкам неабходным. Але гэта ня ўсё. За прастоі не па віне рабочага плацілі толькі палову—50 проц., а ў металюргіі і коксаруднай прамысловасьці, з агрычыны іх асаблівасьцяй, — дзіве траціны тарыфнай стаўкі пачасоўшчыкаў. Неабходнасьць і гэтага прожу цалкам апрацаўна практыкай. Рабочы, пры гэтай умове машней напіўкае на камсклад, які дапускае прастоі, прымушае хутчэй зьнікчаць прычыны прастою, прыняўляе вялікую актыўнасьць у барацьбе з прастоямі. І там, дзе праведзены гэтыя мерапрыемствы — яны даюць добрыя результаты. Вось на заводзе імя Дзяржынскага ў верасьні было 5,6 проц. прастояў на віне рабочага, а ў сьнежні — ужо 3,2 проц.

Такавы результаты перабудовы сыстэмы заработнай платы. Такавы результаты нават пры **непоўным** выкананьні ў жыцьцё 6 умоў тав. Сталіна.

Але ў нас яшчэ ёсьць рэзкі разрыў паміж заработнай платай і ростам прадукцыйнасьці працы.

Нармаваньне працы і заработнай платы часта ў загоне. — Вось, — гаворыць тав. Постышаў, — была нарада работнікаў ТНБ. Пытаюся: ці скажэ вас дырэктар заводу? Не, ніколі. А трэст, аб'яднаньне? — Ніколі.

Аб выніках работы прамысловасьці БССР за 1931 г. і пэрспэктывах на 1932 год

Даклад старшыні ВСНГБ тав. ГРЫСЕВІЧА

У НАС І У ІХ

Таварышы! За мінулы 1931 г.—трэці рашаючы год пяцігодкі рабочая кляса СССР пад кіраўніцтвам партыі і яе ленінскага ЦК на чале з тав. Сталіным, дабілась буйнейшых сусьветна-гістарычных перамог у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Мінулы год знаменуецца завяршэньнем пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Ленінскае пытаньне «хто-каго» канчаткова вырашана на карысьць сацыялізму як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы.

На аснове магутнага росту творчага энтузіязму працоўных мас пяцігодка выконваецца за чатыры гады. Рад буйнейшых прадпрыемстваў і галін прамысловасьці выканалі свой пяцігадовы план у два з паловай — тры гады. З году ў год узмацняюцца тэмпы разгортваньня прамысловасьці. Аб гэтым красамоўна гавораць наступныя даныя. На Савецкім Саюзе ў 1931 годзе было ўкладзена ў народную гаспадарку 16,1 млрд руб. супроць 9,7 млрд. руб. у 1930 годзе — рост на 66 проц.

Калі ўзяць валавую прадукцыю ўсёй сацыялістычнай прамысловасьці па Саюзе, дык яна складае ў 1931 годзе 27 млрд. руб., што дае прырост супроць 1930 году на 21 проц. Прадукцыя прамысловасьці, якая плянуецца ВСНГ СССР, складае 21.800 млн. руб., або больш на 20,5 проц. супроць 1930 году, а па дзяржай прамысловасьці мы маем рост на 28 проц.

Гэтыя дасягненьні па фронце індустрыялізацыі ўзмацняюць эканамічную незалежнасьць і абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

На аснове індустрыялізацыі, гэтай базы сацыялізму, з посьпехам праводзіцца перабудова сельскай гаспадаркі па сацыялістычным ладу. Ліпаркія тэмпы індустрыялізацыі забясьпечылі рашучы паваот бядняцка-серадняцкіх мас сялянства на шлях калектывізацыі. Ужо ў 1931 годзе ў важнейшых збожжавых раёнах у аснову завершана сацыяльная калектывізацыя і на яе аснове пасьпяхова ажыцьцяўляецца лёзунг ліквідацыі кулацтва як класы. 62 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па Саюзе і 50,4 проц.—па БССР аб'яднаны ў калгасы. Такавы важнейшыя вынікі нашай работы за мінулы год.

У той-жа час 1931 год быў годам рэзкага паглыбленьня ўсеагульнага крызісу капіталізму. Даволі сказаць, што лік беспрацоўных за мінулы год у Эўропе і Злучаных Штатах перавысіў 25 мільёнаў чалавек. Заработная плата рабочых рэзка зьнізілася. Дзесяткі мільёнаў працоўных прымушаны жабраваць.

Зусім іншы малюнак мы назіраем у нас у Савецкім Саюзе, у тым ліку ў БССР. На XIII зьезьдзе нашай партыі мы дакладвалі, што ў нас тады было 19.000 беспрацоўных, а зараз у БССР у нас беспрацоўе выліквідавана. Разам з ліквідацыяй беспрацоўя значна ўзрасла заработная плата. У параўнаньні з 1930 годам мы маем рост заработнай платы па Савецкім Саюзе на 19 проц., а па БССР — на 12,6 проц. Лік рабочых на Саюзе павялічыўся ў параўнаньні з 1930 г. на 2 млн чалавек.

Вось кароткая характарыстыка таго становішча, якое мы маем у нас, у краіне, дзе будуецца сацыялізм, і ў краінах капіталу. У нас бурны рост, у іх—поўны заняпад.

ПЯЦІГОДКА ВЫКОНВАЕЦЦА ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Калі мы прасочым за разгортваньнем прамысловасьці БССР, дык павінны з усёй выразнасьцю сказаць, што рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ЦК, на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б, на аснове ленінскай нацыянальнай палітыкі дабілася вялікіх посьпехаў у індустрыялізацыі БССР.

Так, калі ўзяць выпуск валавой прадукцыі ў цэнах і параўнаць 1931 год з 1927-28 годам, дык мы маем рост на 340 проц. У тым ліку рэспубліканская прамысловасьць выпусьціла валавой прадукцыі ў 1927-28 г. на 51,2 млн. руб., у 1929-30 г. — на 234,6 млн. руб., а ў 1931 годзе—на 372 млн. руб. Саюзная прамысловасьць, якая знаходзіцца на тэрыторыі БССР, у 1927-28 г. выпусьціла прадукцыі на 22,2 млн. руб., у 1929-1930 г.—на 47,4 млн. руб., а ў 1931 г. — на 82 млн. руб. Наркамснабаўская прамысловасьць у 1927-28 г. выпусьціла прадукцыі на 17,3 млн. руб., у 1929-30 годзе—39,2 млн. руб., а ў 1931 г.—на 70,9 млн. руб.

Прамысловасьць каапэрацыйная выпусьціла ў 1928-29 годзе прадукцыі на 34,8 млн. руб., у 1929-30 годзе—77,2 млн руб., а ў 1931 годзе—на 158,7 млн. руб.

Такім чынам вы бачыце з гэтых некалькіх лічбаў, які вялізарны рост мы маем за першыя тры гады пяцігодкі ў нашай прамысловасьці. У параўнаньні з 1930 годам у трэцім годзе пяцігодкі мы маем рост на 56 проц., апярэджваючы па тэмпах сярэдніх лічбы па СССР, дзе рост дасягнуў 21 проц.

Калі ўзяць пасобныя галіны і параўнаць выкананьне пяцігодкі па выпуску валавой прадукцыі ў цэнах 1926-1927 году па рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці ВСНГ, дык мы атрымаем наступны малюнак.

Металёвая прамысловасьць у 1931 г. па валавой прадукцыі перавыканала заданьне на тэмпах і дасягнула выкананьня пяцігадовага пляну на 103,6 проц. Шкляная прамысловасьць выканала пяцігодку ў 1931 годзе з перавышэньнем на 23,7 проц., а дрэваапрацоўчая — на 34,7 проц. і г. д.

Ня выканала праграмы тарфяная прамысловасьць, якая ў адносінах да апошняга году пяцігодкі дасягнула 70,5 процантаў. Але, паводле пляну, які мы намячаем на 1932 год яна значна перавысіць па тэмпах апошні год пяцігодкі і мы будзем мець выкананьне пяцігодкі на 184,6 проц.

Прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў у 1931 годзе выканала сваю пяцігодку на 21,5 проц., але-ж у 1932 годзе гэта галіна прамысловасьці павінна перавыканаць сваю пяцігодку на 50,1 проц.

Шкляная прамысловасьць выканала пяцігодку на 53,8 проц., а паводле намячэньняў, якія намі зацьверджаны на 1932 год, павінна выканаць праграму на 102,4 проц. Такі скачок тлумачыцца тым, што па працягу 1932 году мы маркуем увесьці ў эксплёатацыю новы мэханізаваны шкляны завод, які зьяўляецца найбуйнейшым прадпрыемствам ня толькі ў БССР, але адным з буйных заводаў усяго Савецкага Саюзу.

Папаровая прамысловасьць таксама зараз адстае і не дасягнула ў 1931 годзе па тэмпах росту, вызначанага на апошні год пяцігодкі.

Адным з адсталых вучасткаў у разьвіцьці нашай прамысловасьці зьяўляецца ільняная прамысловасьць. Паводле пяцігодкі быў прынят варыянт, што мы павінны рэканструяваць фабрыку «Дзьвіну», скончыць камбінат у Воршы і пабудаваць новы камбінат у Магілеве. Вы ведаеце, што аршанскі камбінат не пабудован і будаўніцтва яго ўключаецца толькі ў другую пяцігодку. Так-жа аб стаіць справа і з магілеўскім ільняным камбінатам.

Паліграфічная прамысловасьць перавыканала свой план на 93 проц.

Такім чынам, калі ўзяць усю прамысловасьць, якая плянуецца ВСНГ, дык яна ў 1932 годзе выканае свой план у адносінах да апошняга году пяцігодкі на 122,2 проц.

КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

У выніку вялікіх укладаньняў у прамысловасьць за тры гады пяцігодкі на БССР увайшла ў эксплёатацыю значная колькасьць новых прадпрыемстваў. Напрыклад, такое прадпрыемства, як Магілеўская шаўковая фабрыка, якая зьяўляецца буйнейшым прадпрыемствам ня толькі ў нашай рэспубліцы, але і адным з буйнейшых прадпрыемстваў ва ўсім Савецкім Саюзе. Панчошна-трыкатажная фабрыка, пабудаваная ў Віцебску, таксама зьяўляецца адным з буйнейшых прадпрыемстваў Савецкага Саюзу. Мы ўзялі рашучы курс на абсталяваньне гэтай фабрыкі машынамі ўнутранага вырабу, значна скараціўшы завоз імпартнага абсталяваньня. У 1932 годзе мы намячаем і мільён з лішнім рублёў выключна на закупку абсталяваньня ўнутры Саюзу. Зразумела, мы ці зможам у 1932 годзе поўнасьцю абсталяваць віцебскую фабрыку машынамі, бо для поўнага абсталяваньня фабрыкі патрэбна звыш 2.000 варштатаў. Такім чынам, гэта работа будзе праводзіцца яшчэ ў пачатку другой пяцігодкі.

Ужо пушчана першая чарга гомельскага заводу с.-г. машын. Ён праскладваўся ў свой час для выпуску машын, разьлічаных на адназобны сэктар вёскі. У сувязі з шпаркімі тэмпамі калектывізацыі завод выпрастоован для выпушчэньня буйнейшых машын для нашай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Трэба сказаць, што ў 1932 годзе мы лічылі неабходным скончыць поўнасьцю абсталяваньне Гомельмашу. Але замест патрэбных 3.800 тыс. руб. ВСНГ Саюзу адпускае толькі 1 мільён руб. Такім чынам, мы поўнасьцю ня зможам абсталяваць Гомельмаш. Таму важнейшай задачай у 1932 годзе на Гомельмашы зьяўляецца тое, каб як мага больш рацыянальна скарыстаць абсталяваньне, якое ўжо ёсьць на заводзе і якое паступіць з саюзных заводаў.

За гэты час пушчан і рад іншых заводаў па дрэваапрацоўчай прамысловасьці і г. д. У 1932 годзе павінен быць пушчан гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат.

Крычаўскі цэментны завод, які пабудован на мясцовым сырцу, зьяўляецца адным з важнейшых прадпрыемстваў. Будаўніцтва заводу мы правялі вялікім інжынэрна - тэхнічным сілам, пры актыўным удзеле мясцовага калектыву рабочых. Завод пасьля пуску першай чаргі, навінен даць 700.000 бочак цэменту ў год.

НЕДАХОЛЫ У РАБОЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Таварышы! Ня гледзячы на такі значны рост, які мы маем у нашай прамысловасьці, на гледзячы на тыя вялізарныя дасягненьні, якіх мы дабіліся ў мінулым годзе, пляны мінулага году, прыпоўнай іх рэальнасьці застаюцца ўсё-ж недавыкананымі на 20 проц. Па капітальных работах мы маем недавыкананьне на 16,8 проц. Па саюзнай прамысловасьці план выпуску валавой прадукцыі выкананы толькі на 67,5 проц., па рэспубліканскай прамысловасьці, якая падпарадкавана ВСНГ — 84,1 проц.; па ільняной прамысловасьці — 81,1 проц. і прамысловасьць Наркамснабу выканала свой галавы план на 75,3 проц., прамкаапэрацыя — на 81,1 проц.

Галоўнай прычынай невыкананьня праграмы зьяўляецца тое, што яшчэ далёка ня ўсюды і далёка ня поўнасьцю ажыцьцёўлены гістарычныя ўказаньні тав. Сталіна. Калі-б сапраўды былі выкананы ўсе 6 умоў тав. Сталіна, мы, бясумоўна, мелі-б яшчэ большыя дасягненьні.

Калі металісты яшчэ могуць зрабіць якія-небудзь спасыланьні на недаснабжэньне сырцом, дык іншыя галіны прамысловасьці, як напрыклад, тарфяная, якая выканала сваю праграму на 53 процанты, або цагельная прамысловасьць, якая працуе выключна на мясцовым сырцу і таксама ня выканала свайго пляну — ня маюць ніякага апраўданьня.

Каб паказаць вам, што для выкананьня прамфінпляну былі ўсе магчымасьці, я прывяду даныя аб на квартальным выпуску прадукцыі па прамысловасьці ВСНГ. У першым квартале выпушчана прадукцыі на 74,2 млн. руб., у другім—на 78,9 млн. руб., трэцім—на 102,7 млн. руб. і чацьвертым—на 106,9 млн. руб.

Чым тлумачыцца такі значны рост у апошнім квартале? Нельга сказаць, што мы мелі больш выстарчальную забясьпечанасьць сырцом прадпрыемствам. Гэты рост тлумачыцца тым, што гаспадарчыя, прафэсыянальныя арганізацыі пачалі перабудоўваць сваю работу, мабілізоўваць масы на выкананьне ўказаньняў тав. Сталіна.

У выніку тэмпы ўзмацніліся. Скурная прамысловасьць свой план выканала на 102,1 проц. Асобныя прадпрыемствы скуранай прамысловасьці, напрыклад, завод «Бальшавік» выканаў план на 108 проц. Гэты завод ня толькі выканаў сваю праграму па валавой прадукцыі, але дабіўся значнага палепшэньня якасьці прадукцыі. Пачынаючы з IV кварталу, завод перавыконвае свае пляны і ЦК партыі паставіў пытаньне аб узнагароджэ яго ордэнам Леніна.

Вы ведаеце, што завод імя Сталіна меў значны прарыў у першай палове году. Але ў выніку перабудовы работы ў апошнія месяцы гадавая праграма выканана на 102,3 проц.

Завод «Пралетарская праца» таксама перавыкладаў сваю праграму і скончыў гаспадарчы год з выкананьнем пляну на 159,7 проц., рымарная фабрыка — на 105,4 проц. Прадпрыемствы па шэйнай прамысловасьці — «Камінтэрн» — на 131 проц., фабрыка імя Валадарскага — на 134 проц., імя Крупскай — на 136 проц.

Добра выканала план паліграфпрамысловасьць: друкарня імя Сталіна—на 99 проц., Палесдрук—на 103,4 проц., магілеўская друкарня—на 135 проц.

У сувязі з неканканьнем праграмы па ільнозагатоўках, мы павінны былі ўнесьці некаторыя карэктывы ў плян тэкстыльнай прамысловасьці. І той плян, які мы зьмянілі, выканан на фабрыцы імя К. Маркса на 98,8 проц., а па суконнай фабрыцы—на 99,6 проц., фабрыка «Дзьвіна» таксама ня выканала свайго прамфінпляну.

Асабліва дрэнна стаіць справа на выкананьні якасных паказальнікаў нашай прамысловасьці. Зьніжэньне сабекошту было запраектавана на 8,1 проц.; фактычна сабекошт зьнізан на 1,2 проц. Гэта зьяўляецца ганебным зьявішчам у рабоце нашай прамысловасьці. Мы запраектавалі, што рацыяналізатарскія мерапрыемствы павінны даць 60-70 проц. па зьніжэньні сабекошту; на самой-жа справе зьніжэньне сабекошту за лік ажыцьцяўленьня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў праведзена толькі на 15-20 проц.

Трэба в усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што на пасобных вашых прадпрыемствах мы маем лішнюю рабочую сілу. У рэзультаце рабсіла выкарыстоўваецца нерацыянальна і павышае сабекошт прадукцыі. Дырэктывы ЦК партыі аб давядзеньні ліку рабочай сілы ў адпаведнасьці з прамфінплянам, на радзе прадпрыемстваў ня выкананы.

Значная работа прароблена ў апошнія 1½ года і ў галіне падрыхтоўкі кадраў. Па лініі прамысловасьці ВСНГ мы маем 5 вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў у той час, як 2-3 гады назад мы ня мелі ніводнай навучальнай установы. Значна пашырылася сетка фабрычных школ і тэхнікумаў. У галіне асьветы па лініі прамысловасьці мы дасягнулі значнага зруху. Але гэтыя зрухі на сёньняшні дзень яшчэ ні ў якай ступені не здавальняюць. Мы адчуваем вялікі недахват тэхнічнага пэрсаналу. Тэхнічны пэрсанал на прадпрыемствах складае яшчэ нязначны процант.

Крэдытная рэформа, якая была праведзена ў 1931 годзе, зьмяніла сьвятэму і форму крэдытаваньня. Гэта рэформа мела станоўчы ўплыў на ўсю гаспадарку народную гаспадарку і ў першую чаргу на прамысловасьць. Калі ўзяць аспоўныя сумы аборотных срокаў на 1 студзеня 1931 году, дык яны складалі 39 млн. рублёў, а на 1 студзеня 1932 г. —48 млн. руб. Але ў сувязі з тым, што мы маем значны прарыў у чацьвертым квартале а прычыны перабояў у падачы электраэнэргіі БелДРЭС, фінансавае становішча некаторых прадпрыемстваў і нават галін прамысловасьці пагоршылася.

Перабоі на Асінаўскай станцыі блаумоўна кладуцца вялікім цяжарам на прамысловасьць. Я не хачу сказаць, што і мы ў гэтым не вінаваты. З прычыны дрэннага кіраўніцтва з боку самой Асінаўскай станцыі, невыстарчальнага кіраўніцтва з боку ВСНГ і асабліва невыстарчальнага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку Белторфу станцыя не забясьпечана ў патрэбнай колькасьці аплам.

Але трэба сказаць, што побач з гэтым і цэлым радам тэхнічных непаладдаў, мае месца і дрэнная работа адпаведных раённых арганізацый. Як падвозіўся торф? Вось прыклады. Уваравіцкі раён, замест таго, каб падвезьці з торфазаводу «Касьцюковка» 15.000 тон, падвёз толькі 600 тон да палатна чыгункі; Полацкі раён замест 1.000 тон падвёз толькі 200 тон; Ворша — раён Смаляны — замест 500 тон падвёз толькі 30 тон; Копасьскі — замест 175 тон — 30 тон, Капаткевічы — замест 1.204 тоны — 163 тоны, Рагачоў і Жлобін замест 7.000 тон — 2.400, Смаляны — замест 7.000 тон—6.000 тон. Толькі аднэ раёны, які больш-менш праводзіць падвазьлівую падвозу торфу, — гэта Крычаўскі раён.

У рабоце прамысловасьці ёсьць яшчэ буйныя недахопы. Мы павінны мабілізаваць усе свае сілы, каб іх неадкладна выкінуць.

Пераходжу да зазначэньня, якія паўстаюць перад намі ў 1932 г.

АСНОЎНЫЯ НАПРАМАК РАЗЬВІЦЬЦЯ У 1932 г.

Плян разьвіцьця прамысловасьці на 1932 год пабудован на прынцыпах максымальных тэмпаў далейшай індустрыялізацыі краіны і няўхільнага павышэньня матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных мас. Асноўнай цэнтральнай задачай зьяўляецца фарсаванае разьвіцьцё галін прамысловасьці, якія вырабляюць сродкі вытворчасьці, і рэканструкцыя матар'яльна-тэхнічнай базы тарфянай прамысловасьці і будматар'ялаў. Ва ўсёй суме капіталаўкладаньняў па прамысловасьці ВСНГБ гэтыя дзьве галіны займаюць у 1932 г. 43 проц., супроць 36,1 проц. у 1931 г.

Асноўныя паказальнікі пляну 1932 г. характарызуюцца наступным чынам.

Уся ВАЛАВАЯ ПРАДУКЦЫЯ прамысловасьці вызначана ў суме 1 мільярда 118 млн. руб., што азначае прырост на 51 проц. у параўнаньні з мінулым годам, у тым ліку па дзяржаўнай прамысловасьці — прырост на 48,2 проц. (сюды ўваходзіць прамысловасьць ВСНГ, Наркамснабу і саюзная).

Па прамысловасьці ВСНГ ЗЬНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ запраектавана на 6 проц. КОЛЬКАСЬЦЬ РАБОЧЫХ даводле пляну павінна вырасьці на 22,2 проц. у параўнаньні з 1931 г., або на 23.900 чалавек. ПРЫРОСТ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ запраектаваны на 7 проц.

Аб'ём капітальных работ па ўсёй прамысловасьці (без электрабудаўніцтва) вызначан у 95,5 млн. руб. З усіх капіталаўкладаньняў на групу «А» выпадае 91 проц., па групе «Б»—9 проц. Праўда, у гэтым пытаньні магчымы яшчэ некаторыя вымогі.

Валавая прадукцыя прамысловасьці ў цэнах 1926-27 году акрэслена ў сумме 1.113 млн. руб. З іх па саюзнай — 136.400 тыс. руб. і рэспубліканскай — 495.600 тыс. руб. Па мясцовай прамысловасьці — 52.800 тыс. руб., па прамысловасьці Наркамснабу — 182.200 тыс. руб., па прамысловай каапэрацыі — 229 млн. руб.

Прыведзеныя лічбы ясна гавораць аб тым, што тэмпы росту валавой прадукцыі прамысловасьці БССР вышэй за сярэдні процант па Саюзе (па дзяржаўнай прамысловасьці БССР — 48,2 проц., па Саюзе — 36,8 проц.). Тут ярка выявіцца рэзультат ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, накіраванай на максымальны знаёмчыны і культурны ўзьдым рэгіёнаў адсталых, прыгнечаных царыцкай акраін былой царскай імпэрыі.

КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА па дзяржаўнай прамысловасьці мы намячаем у разьмеры 71.963 тыс. руб., у тым ліку па саюзнай прамысловасьці—27.963 тыс. руб., па рэспубліканскай—36.000 тыс. руб., па мясцовай — 8.200 тыс. руб., па прамысловасьці Наркамснабу,—12.500 тыс. руб.

Як забясьпечваецца гэта капітальнае будаўніцтва будматар'ялам? На 1932 г. мы намячаем наступныя заданьні: выпрацаваць цэглы звычайнай 353 млн. штук, здабыць пашы 198 тыс. тон., выпрацаваць чарапіцы 8.400 тыс. шт., толі—1.500 тыс. кв. мэтраў, фібраліту—150.000 кбм., трэпелу—16.000 тон.

Вось тая праграма вырабу будматар'ялаў, якая павінна забясьпечыць ня толькі прамысловасьць ВСНГ, але і ўсю народную гаспадарку БССР.

ТОРФ, БУДМАТАР'ЯЛЫ, МЭТАЛЬ, ЭЛЕКТРА-ГАСПАДАРКУ—ПАД АСОБНЫ НАГЛЯД УСЯЕ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ

Пераходжу да канкрэтных задач па асобных важнейшых галін прамысловасьці.

Вялікую праграму ўстанаўлем мы па ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ. Калі апошняя ў мінулым годзе выпрацавала 690.000 тон торфу, дык на 1932 год ЦК зацьвердзіў заданьне ў 1.648.000 тон, у тым ліку па рэспубліканскай прамысловасьці — з 376 тыс. да 1.000.000 тон. Як бачыце, скачок з 376.000 тон да 1.000.000 па рэспубліканскай прамысловасьці — надзвычай вялікі. Праграма вялізарнейшая. Выкананьне яе патрабуе з боку ўсёй партыйнай арганізацыі, усіх рённых выкавучых камітэтаў максымальнай увагі. Трэба памятаць, што торф у будучым годзе павінен ужо складаць 30 процантаў ва ўсім апаливным балянсе рэспублікі. (Прамыслова-тэхнічная група).

У ліку важнейшых задач, з вырашэньнем якіх зьвязана выкананьне пляну здабычы торфу, зьяўляецца пытаньне аб звароце на торфазаводы ўсіх лёкамабілёў, якія на зімовы пэрыяд былі прадастаўлены асобным прадпрыемствам. На гэтым пытаньні ёсьць спэцыяльныя пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР. Яны павінны быць безагаворачна выкананы. Лёкамабілі неабходна свазічасова дастаўляць на торфазаводы.

Для пасьпяховай работы торфазаводаў надзвычай важнае значэньне набывае пытаньне карэннага палепшэньня кіраўніцтва работай усіх зьвеньняў торфпрамысловасьці. Намі ўжо зроблены першыя крокі ў гэтых адносінах, разбуйнена Белторфаб'яднаньне, 12 больш дробных торфазаводаў пераданы ў непасрэднае веданьне спажыўцоў торфу. За торфаб'яднаньнем засталося 11 буйнейшых заводаў. Гэта мерапрыемства ўжо стварае прадпасылкі для канкрэтызацыі кіраўніцтва, яго палепшэньня. Наша задача — канцэнтраваць увагу ўсіх гаспадарнікаў, партыйных і прафэсыянальных арганізацый вакол далейшага палепшэньня апэрацыйнага і тэхнічнага кіраўніцтва ў галіне торфазабычы.

Забясьпячэньне неабходнай рабочай сілай зьяўляецца адной з кардынальных задач торфапрамысловасьці. Да арганізаванага набору рабочай сілы, да заключэньня заводамі дагавораў з калгасамі і бядняцка-серадняцкім сялянствам трэба прыступіць, ня трацячы ніводнага дня. Трэба памятаць, што торфы на торфазаводах рэспубліканскай прамысловасьці павінна працаваць 18.900 рабочых, супроць 9.000 у мінулым годзе. Гэта, таварышы, вялізарнейшая армія. Вярбоўка яе патрабуе напружаньня сіл усіх арганізацый.

Мы павінны спачатку тарфянога сэзону перавесьці ўсе агрэгаты, зьмены на заводах разрахунак, пырока арганізаваць гаспадарча - разрахунковыя брыгады. Гаспадарчы разрахунак павінен зьявіцца адным з магутных сродкаў барацьбы за торффінпляны.

На менш важнае значэньне набывае пытаньне палепшэньня якасьці торфу, рашучая барацьба за паніжэньне яго вільготнасьці. Мы ніякім чынам не павінны дапусьціць такіх зьявішч, якія мелі месца ў мінулым годзе, калі ў радзе выпадкаў вільготнасьць торфу даходзіла да 70 проц. Вось чаму кожнае ходзіла да 70 проц. Вось чаму кожнае прадпрыемства павінна распрацаваць канкрэтныя тэхнічныя пляны, забясьпечыць высокую якасьць торфу.

Неабходна ўжо зараз шырока разгарнуць работу па выкананьні пляну жыльлёвага будаўніцтва, па арганізацыі неабходнай сеткі культурных і сацыяльна-бытавых устаноў.

Валавая прадукцыя МЭТАЛЯПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ўзрастае на 28 проц. у параўнаньні з 1931 годам і ў капітоў. ным азначэньні дасягае 50.400 т. руб. Гэтым азначэньне заданьняў та азначае перавышэньне апошняга пляну гадоў на 28 проц. Металяпрамысловасьць у бягучым годзе асвойвае рад складаных машын. Так, у асаўтымэнце значна павышаецца выпуск сіласарэзак (8.000 штук замест 2,3 тыс. у 1931 годзе), бульбасартавак (5.000 штук супроць 1,6 тыс.), макухадрабілак (6.000 супроць 1,9 тысяч), бульбакапалак (7 тыс. супроць 2,6 тыс.). Новыя відам вырабу абсталяваньня, апарата сьпіртавога, трэба адзначыць кармазапарнікі «Генца» (190 шт.) і сьвідравальныя варштаты 40 мм. (70 шт.). У 1932 г. значна пашыраецца выраб будаўнічых цьвікоў — з 4,9 тыс. тон у 1931 годзе да 7,9 тыс. тон у 1932 годзе.

Запраектаванае капітальнае будаўніцтва па мэталяпрамысловасьці ў суме 5,8 млн. прадугледжвае далейшае палепшэньне тэхнічнай базы гэтай галіны прамысловасьці. Вызначанае на 1932 год будаўніцтва трубаліцейнага заводу і іголкавай фабрыкі мае надзвычай важнае значэньне ў сэнсе фазьвіцьця камунальнай гаспадаркі і вызваленьня імпартных іголак.

У галіне машынабудаўніцтва мы задасьпечваем скаканьне кадцельнага пэху на заводзе імя Варашылава і механічна - зборачнага цэху «Камунара», пашырэньне «Чырвонага адраджэньня» ў Магілеве. Намечана шырокая праграма будаўніцтва і скаканьня абсталяваньня Гомельмаша. Тут трэба адзначыць, што капіталаўкладаньні ў Гомельмаш, вызначаныя ВСНГ Саюзу, не забясьпечваюць скаканьня ўсіх работ. Нам патрэбна 3.800 тыс. руб., а адпусьцілі толькі 1 млн.

Нельга не адзначыць значных укладаньняў на мэталяпрамысловасьці ў галіне палепшэньня жыльлёва-бытавых умоў рабочых. Вызначаныя на гэты мэту 935 тыс. руб прадугледжваюць значнае разгортваньне будаўніцтва ў Менску, Гомелі, Віцебску і інш. гарадох.

Праграма вырабу БУДАЎНІЧЫХ МАТАР'ЯЛАЎ складана на аснове максымальнага скарыстаньня вытворчых магчымасьцяй. Я ўжо падаваў лічбы аб вызначаным асартымэнце і колькасьці будаўнічых матар'ялаў. Трэба адзначыць што, калі ў 1931 годзе амаль адным відам будматар'ялаў у нас была пыла, дык у 1932 годзе мы ўводзім цэлы рад новых відаў сьпечаных матар'ялаў, як-та: фібраліт, камінпыт, тэрмалёўныя каменьні і г. д. Значна павялічваецца ўдзельная вага (да 35 проц.) эфэктыўнай цэглы. Прадугледжан пуск пэмэнтнага заводу ў Крычаве, пуск ніклага цыклозаводу ў Гомелі.

У адпаведнасьці з тымі задачамі, якія стаяць перад прамысловасьцю па вырабе будматар'ялаў, плян капітальнага будаўніцтва (на дзяржаўнай прамысловасьці без каапэрацыйнай) вызначан у суме 21.970 тыс. руб. супроць 16.193 тыс. руб. у 1931 г.

Гэта год вызначэньня годам вялікіх вытворчасьцяй для ХІМІЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ — азотнай, серакислароднай і косьмэтычнай. Уступаюць у строй пенальні порцэляновага заводу. Перад хімічнай прамысловасьцю паўстае супэрная задача вялікіх бесьпячэньня новых прадпрыемстваў тэхнічным пэрсаналам, кваліфікаванай рабочай сілай. Валавая прадукцыя хімічнай прамысловасьці возьме плян у павялічэньня больш чым на 100 проц. у параўнаньні з 1931 годам і ў капітоўным азначэньні дасягне 5,6 млн. руб. Перад хімічнай прамысловасьцю пытаньне аб поўнай рэалізацыі свайго прамфінпляну паўстае з выключнай вострасьцю таму, што гэтая галіна прамысловасьці пазначана адстае ад заданьняў пяцігодкі пляну, што ў вялікай ступені зьвязана з недапушчальнай запяжкай новага будаўніцтва і што стаіць задачу скаканцэнтраваць максымум сіл на «вузкавозкае скаканьне» ўсіх аб'ектаў капітальнага будаўніцтва.

Перад намі стаіць складаная адказная задача дамагчыся максымальнага тэмпаў у разгортваньні ЭНЭРГА-ГАСПАДАРКІ. Плян 1932 году намечае значны зрух у галіне электрыфікацыі народнай гаспадаркі БССР. Аб'ём капіталаўкладаньняў, зацьверджаны саюзнымі органамі, забясьпечвае разгортванае будаўніцтва Менскай ЦЭЦ, прадасьпечвае у 1932 годзе падрыхтоўчых работ на будаўніцтве у 1933 годзе Гомельскай ДРЭС, падрыхтоўку пуску другой чаргі БелДРЭС імя Сталіна. Агульны прырост устаноўленай магутнасьці вызначаецца ў разьмеры 8.500 квт., што дае рост супроць 1931 году на 18,8 проц. З найбольш буйных аграгатаў, што здаюцца ў эксплёатацыю ў 1932 годзе, трэба адзначыць устаноўкі на прадпрыемствах саюзнага значэньня. Магілеўскі шаўковай фабрыцы, Крымаўскім цэментным заводзе і Новабеліцкім дрэваапрацоўным камбінаце. Выпрацоўка электраэнэргіі ўзрастае да 320 млн. квт-гадзін супроць 143 млн. у 1930-1931 годзе.

Рост валавой прадукцыі ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ўстаноўлен на 38,5 проц. на фабрыках рэспубліканскай прамысловасьці, і на 138 проц.—на добрускай фабрыцы «Герой працы». Гэты рост грунтуецца на поўным скарыстаньні ўсяго наяўнага абсталяваньня, што абазначае ўсіх нас адкласьці максымум увагі пытаньню поўнай мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў.

ЛЁГКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ВСНГ павялічвае аб'ём свайго прадукцыі з 280,9 млн. руб. у 1931 годзе да 365,6 млн. руб. у 1932 годзе, рост на 30,3 проц. Капіталаўкладаньні ў лёгкую прамысловасьць ВСНГБ вызначаны ў суме 5.915 тыс. руб., прычым намечан рад работ па рэканструкцыі такіх прадпрыемстваў, як «Дзьвіна», канфэкцыянарна-пашыўная фабрыка, Менская абутковая фабрыка, скаканьне будаўніцтва Дому друку і інш.

ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ—АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО

Трэба адзначыць, што цэнтральнай, галоўнай задачай для ўсёй прамысловасьці зьяўляецца задача рашучага ўздыму якасных паказальнікаў работы. 1932 год павінен стаць годам бязмоўнага выкананьня заданьняў па зьніжэньні сабекошту, росьце прадукцыйнасьці працы, годам карэннага палепшэньня якасьці прадукцыі. Ва ўсю шырыню паўстае пытаньне максымальнай мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў, вышукваньня ўсіх магчымых дадатковых крыніц унутры-прамысловых назапляньняў.

Адной з важнейшых умоў выкананьня колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну 1932 году зьяўляецца пытаньне ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ, рацыянальнае скарыстаньне наяўнай рабочай сілы, барацьба з лішкамі рабочай сілы, якія ёсьць на пасобных прадпрыемствах. Плян падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў прамысловасьці, які прадугледжвае на лініі ФЗВ кантынгент прыёму ў 6.000 чал. і прыпуск праз курсы ДРА 18.000 рабочых — павінен быць цалкам выкананы. Неабходна разгарнуць шырокую работу на пашырэньні кантынгенту ВТНУ і тэхнікумаў, па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы адпаведнай прамысловасьці неабходным абсталяваньнем, перадачае рад новых заводаў (экскаватарны завод на Ўрале з праграмай у тры тысячы экскаватараў, завод турбінных машын у Іванаве і інш.), якія будуць пушчаны ў бягучым годзе. Заканчваючы свае прамовы, тав. Талакончэў выказвае ўпэўненасьць у тым, што, на-бальшавіцку мабілізуючы работчыя масы, палепшаючы транспорт, партыйна справяцца з пранцыямі задатачнай, што стаіць перад нашай і мэтаўтрэчнай прамысловасьцю. Выкананьне пляну 1932 году, — запэўніць тав. Талакончэў, — забясьпечыць ня толькі выкананьне і перавыкананьне пяцігодкі за чатыры гады, але і створыць моцную базу для выкананьня другой пяцігодкі і поўнага вызваленьня ад замежнай экзамінацыі і ласкі.

Тав. Кубяк прысьвячае сваю прамову разьвіцьцю прамысловасьці ў Іванаўскай вобласьці. Побач з разьвіцьцём тэкстыльнай прамысловасьці, — гаворыць тав. Кубяк, — у нас у гэтай галіне за апошні год шмат расьце металяпрамысловасьць і хімічная. Прамова спыняецца далей на недахопах у будаўніцтве Яраслаўскага сумавазбуднага камбінату, які павінен забясьпечыць вазрыкамі ўсю нашу аўтамабільную прамысловасьць. У гэты год пытаньню з боку вартаўніцтваў, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый. Капіталаўкладаньні на лініі сацыяльна-бытавога і культурнага абслугоўваньня рабочых павялічваюцца з году ў год. Пашыраецца база рабочага забясьпячэньня. Трэба больш рацыянальна і эфэктыўна скарыстоўваць тыя сродкі і магчымасьці, якія ў нас ёсьць. Побач з пастаноўкай цэнтралізаванага снабжэньня, мы абавязаны шырэй разгарнуць самазагатоўкі. Гэтай справе ў нас аддаецца вінна недастаткова ўвагі. У радзе

Люты вырашае посьпех ільназагатовак

ШЫРОКА-РАЗГОРНУТАЙ, ПАЛІТЫЧНА-МАСАВАЙ РАБОТАЙ ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ЛІКВІДАЦЫЮ АДСТАВАНЬНЯ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ

Адстаючы раён

ТАЛАЧЫН. (Наш кар.).

На 25 студзеня плян ільназагатовак па Талачынскім раёне выканан на 40,7 проц. За 5 дзён прырост складае ўсяго 0,1 проц. Па калгасах плян выканан на 58,2 проц., па аднаасобным сэктары — на 12,8 проц., цьвёрды заданьні з кулацка-заможных гаспадарак спагнаны толькі на 15,7 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб выключна марудных тэмпах ільназагатовак. Некаторыя калгасы па гэтага часу взяты на скончыці ачэпадоўці ільну. Усе 6 калгасаў Пагулянскага сельсавету толькі цяпер пачынаюць апрацоўку.

Зусім не наладжан кантроль за выкананьнем цьвёрдых заданьняў. Па Валасоўскім сельсавеце ваят нельга ўстанавіць, каму лацы цьвёрдыя заданьні. Парт'ячэйка і сельсавет лічыць гэта «дробнай» справай.

Асцярожнае Белгацкіно не паспяшаецца тварам да ільназагатовак. Прамтавары на суму 24.000 руб., прызначаныя для стымулявання ільназагатовак, пролежалі на складзе бо руху 19 дзён. У некаторых калгасах ня выконваецца дырэктыва аб аддаце апрацоўкі часткова панёўшымі грэбнямі.

Зусім слаба разгорнута арганізацыйна-масавая работа вакол загатовак. Многія ізадрыя партыйныя і загатоўчыя арганізацыі бяздзейнічаюць.

Плян загатовак зусім рэальны. Аб гэтым гаворыць вопыт ранку калгасаў, якія перавыканалі плян. Так, калгас «Чырвоны Кастрычнік», Воўкаўскага сельсавету, выканаў плян на 134.9 проц., калгас імя Леніна — на 124 проц., «Чырвоны асьветнік» скончыў адну ільну ад 1 сьнежня і г. д.

Шклоўскі раён абавязан неадкладна дабіцца рашучага зруху і круты ўзьняць тэмпы ільназагатовак. Дырэктыва XIV зьезду КП(б)Б аб ліквідацыі адставаньня на працягу 10 дзён павінна быць рэалізавана.

* *

За апортуністычную бязьдзейнасьць райком партыі абвясьціў суровую вымову старшыні Яўлахаўскага сельсавету тав. Васілеўскаму, сакратару парт'ячэйкі тав. Ляховічу, старшыні Няхлюдаўскага сельсавету т. Леонову, сакратару парт'ячэйкі тав. Сасноўскаму і ўшчуваканьням райкому і райвыканкому т. т. Аўсеенка, Сушкевічу і Прайю. Райком пастанавіў камандзіраваць у сельсаветы і калгасы для паскарэньня тэмпаў ільназагатовак 67 работнікаў.

Дашкевіч.

Рапарт калгасу „Ленінкси Шлях"

ЧЭРВЕНЬ.

КАЛГАС «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», Хутарскога сельсавету, Чэрвеньскага раёну, рапартуе аб дасягненьнях у загатоўчай кампаніі.

Плян загатовак ільнавалакна выкананы на 100 проц., ільнасеня — на 117 проц., збожжа — на 142 проц.

Гэтыя посьпехі дасягнуты пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі шляхам рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва і правядзеньня шырокай растлумачальнай работы сярод калгаскікаў.

Па даручэньні агульнага сходу калгасьнікаў —

Старшыня праўленьня БУДНІК.

Калгасьнік КАВАЛЕНАК.

Захавальнымі запіскамі падмянілі загатоўчую работу

ГАРАДОК.

Гарадоцкі райкаапсаюз у зводны на 1 студзеня паказаў, што загатоўлена ільну 835 тон ці 47 проц гадавога пляну. У сапраўднасьці-ж было загатоўлена 604 тоны, ці 35,5 проц.

Гэта не памылка, а сьвядомае «очковтирательство».

У чым справа? Райкаапсаюз лічыць, што траста загатоўлена 2.023 тоны, у сапраўднасьці-ж—869 тон. Дзе рэшта трасты—сам райкаапсаюз ня ведае.

Траста «загатаўлялася» габінэтным паралкам. Акты аб здачы ільну складаліся ў пацыляры райкаапсаюзу. Калгасы атрымлівалі 75 проц платы за трасту і давалі... захавальныя расьпіскі. Гэтыя расьпіскі сталі масавай зьявай. Паводле зводак было ўсё добра.

На справе-ж ня тое. Возьмем прыклад. Калгас «Чырвоны пуцілавец» абавязаўся здаць ільну на 10.000 руб. Гроны атрымаў, а зараз здаўны валакна на 2.000 руб., заявіў «ільну няма». Гэта не адзіны прыклад.

Патрэбна неадкладна ўсю гэту справу расьсьледаваць і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

ДЗЕЙКА.

Кантрактанты ня выконваюць сваіх абавязацельстваў

ДУБРОЎНА.

Дубровенскі раён — адзін з буйнейшых ільнаводчых раёнаў БССР. У гэтым годзе ён павінен загатовіць 1000 тон валакна. На 25-га студзеня плян выканан усяго на 35,5 проц.

Такі тэмп загатовак ставіць пад пагрозу выкананьне заданьняў па загатоўцы ільнавалакна.

Асноўныя прычыны такога адставаньня — прошпан арганізацыя першачатковай апрацоўкі валакна ў калгасах і адсутнасьць арганізацыйна-масавай работы сярод бедняцкоў і серадняцкоў — аднаасобнікаў.

У калгасе «Чырвоны май», Сватаньцкага сельсавету, апрацоўка ільну праходзіць зусім марудна. Апрацавана і здана дзяржаве ня больш 50 проц. пляну. Зацягваньне апрацоўкі тлумачыцца слабым кіраўніцтвам праўленьня калгасу і заваладам працыцыплины сярод калгасьнікаў. З 70-80 калгасьніц штодзенна на працу па ільнаапрацоўцы выходзіць ня больш як 15-20. Гэтымі днямі пасьля агульнага сходу былі створаны маладзёжныя брыгады па апрацоўцы ільну. Але апрацоўка была сарвана таму, што не падрыхтавалі сушыльныя пункты.

Дрэнна праходзіць загатоўкі па аднаасобным сэктары. Па Сватаньцкім сельсавеце значная частка аднаасобнікаў ня выканала кантрактацыйных умоў. Сельсавет ня прымае мер, каб прымусіць кантрактантаў выканаць свае абавязацельствы.

Неабходна рашуча ўдарыць па зрыўшчыках апрацоўкі і здачы ільну і забясьпечыць ударныя тэмпы загатовак. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на ліквідацыю адставаньня аднаасобнага сэктару.

С.

"Ні аднаго цэнтнэра збожжа - прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

Касьцюковіцкі раён павінен

у бліжэйшыя-ж дні завяршыць збожжазагатоўкі

XVII партканфэрэнцыю адзначыць поўным выкананьнем пляну кожным раёнам, сельсаветам, калгасам

ЗАВАЯВАЦЬ КАНЧАТКОВУЮ ПЕРАМОГУ

Касьцюковіцкі раён па памерах збожжазагатоўчага пляну стаіць на другім месцы (пасьля Слуцку) па рэспубліцы. У бягучую кампанію раён павінен загатовіць 4244 тоны збожжа. На 25 студзеня плян выканан на 87,3 проц. Між тым, раён меў усе магчымасьці ня толькі дабіцца выкананьня, але і перавыкананьня пляну ка XIV зьезду КП(б)Б.

Гэта з усёй выразнасьцю давялі перадавыя сельсаветы, калгасы, якія, разгарнуўшы сапраўды бальшавіцкую работу, мабілізавалі шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу з кулацтвам і яго агентурай —«правымі» і «левымі» апартуністамі, в посьпехам завяршылі ўжо збожжазагатоўкі. Некаторыя сельсаветы значна перавыканалі свае заданьні. Так, Хоцімскі месцачковы савет выканаў 123,1 проц. пляну, Касьцюковіцкі — 123 проц. пляну, Белодубраўскі — 114 проц., Хоцімскі сельсавет — 113,5 проц., Гаўрыленскі — 111,7 проц., Сілічэўскі — 110,7 проц., Негінскі — 108,2 проц., Дзямідавіцкі — 106,8 проц., Дубраўскі — 105,5 проц., Саматавіцкі—104,1 проц. і г. д.

Тое, што раён у цэлым яшчэ не выканаў збожжа-здачу тлумачыцца неадпушчальным адставаньнем раду сельсаветаў, дзе мясцовыя арганізацыі на здолелі па-бальшавіцку арганізаваць збожжазагатоўкі. Да гэтых сельсаветаў адносяцца: Вялікаборскі — 54,8 проц. пляну, Ветухноўскі — 61,6 проц., Смолькаўскі—62,7 проц., Бахапаўскі — 65,9 проц., Студзянецкі — 66,7 проц. і інш.

У паасобных сельсаветах дагэтуль ацідныя скрыўленьні палітыкі партыі пры правядзеньні заготовак. Гэтыя скрыўленьні выявіліся ў падмене масава-палітычнай работы грубым адміністраваньнем у адносінах да бедняцкоў і серадняцкоў. Такія факты мелі месца ў Смолькаўскім і Нікаўскім сельсаветах, дзе праводзіліся сыстэматычныя вобыскі ў бядняцка-серадняцкіх гаспадарках. В. Борскі сельсавет давёў цьвёрдыя заданьні да 41 гаспадаркі, сярод якіх была значная частка бядняцкіх і серадняцкіх.

Гэтыя «лявацкія» загібы перавялі ся з махровай правa-апартуністычнай практыкай, якая атрымала сваё выяўленьне ў адкрытым патураньні кулацка-заможным элементам, у прымірэнчых адносінах да кулакоў, якія злосна сабатуюць збожжазагатоўкі. Касьцюковіцкая РКК-РСІ за апартуністычную практыку выключыла з партыі старшыню Нікаўскага сельсавету і абвясьціла суровую вымову сакратару парт'ячэйкі. Бюро Нікаўскай ячэйкі КП(б)Б распушчана.

Барацьба са скрыўленьнямі палітыкі партыі ў загатоўках, з апартуністычнай практыкай і яе канкретнымі носьбітамі павінна быць узмоцнена. Касьцюковіцкі раён павінен у бліжэйшыя-ж дні рапартаваць аб канчатковай перамозе на збожжазагатоўчым фронце.

С. Г.

За дэкаду толькі 1 проц. прыросту

ШКЛОЎ (Наш кар.).

Дэкадны штурму адставаньня ў збожжазагатоўках на Шклоўскім раёне прайшоў нездавальняюча і ня даў належных вынікаў. Замест таго, каб за час дэкадніка завяршыць збожжазагатоўкі, поўнасьцю выканаць гадавы плян, раённыя арганізацыі «дабіліся» за дэкаду ўсяго 1 проц. прыросту. На 15 студзеня гадавы плян быў выканан на 76,6 проц., а на 25 студзеня—толькі на 77,6 проц.

На сёньняшні дзень ёсьць яшчэ сельсаветы, якія ня выканалі нават і паловы заданьняў. Так, Заходзкі сельсавет рэалізаваў толькі 35 проц пляну. Еганаўскі—40 проц. пляну. У глыбокім тыле цягнуцца таксама Падгайцаўскі сельсавет (58 проц.), Зарэчна-Шклоўскі (62 проц.), Рыжкоўскі (63 проц.).

Улапаўскі, Фашчаўскі і Таўначоўскі сельсаветы за цэлую дэкаду не загатовілі ніводнага кілёграма збожжа. Гатага нельга растлумачыць інакш, як махровую апартуністычную практыку, як яўнае ігнараваньне цыркулярных дырэктыў партыі і ўраду аб загатоўках. РК КП(б)Б павінен моцна ўдарыць па дэмабілізаньнёвых настроях, якія пануюць у гэтых сельсаветах, прыцягнуць да суровай адказнасьці канкретных носьбітаў зла.

Адстаючым вучасткам збожжазагатовак па Шклоўшчыне зьяўляюцца аднаасобны сэктар і асабліва дрэнна паступае збожжа па цьвёрдых заданьнях з кулацка-заможных элементаў. На 25 студзеня цьвёрдыя заданьні спагнаны ўсяго на 54,6 проц.

Гэта гаворыць аб тым, што націск на кулацка-заможныя элементы вельмі слабы, а месцамі зусім адсутнічае.

У бліжэйшыя-ж дні павінна быць за завяшана канчатковая перамога на збожжазагатоўчым фронце. Шклоўская партарганізацыя мае ўсе магчымасьці, каб у дні работы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі завяршыць збожжавую кампанію, поўнасьцю выканаць плян.

Ян.

Чырвоны абоз у гонар XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі

ГАРАДОК (ПА ТЭЛЕФОНУ).

У ПАДАРУНАК XVII УСЕСАЮЗНАЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ КАЛГАС ІМЯ КАЛІНІНА, ПЕРШАМАЙСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, АРГАНІЗАВАЎ ЧЫРВОНЫ АБОЗ СА ЗБОЖЖАМ, ЗДАЎШЫ ЗВЫШ ПЛЯНУ 7,5 ЦНТР. ЖЫТА, 1,5 ЦНТР. ЯЧМЕНЮ І КАЛІЯ АДНАГА ЦЭНТНЭРА АЎСА.

ВІШНЕЎСКІ.

Ня спыняцца на дасягнутых посьпехах

БЫХАЎ.

Другі Грудзінаўскі сельсавет Быхаўскага раёну, выканаў гадавое заданьне па збожжазагатоўках на 112,9 проц. Гэта дасягнута ў выніку рашучага націску на кулака і непрымірымай барацьбы з яго агентурай. Посьпех вырашыла шырока - разгорнутая арганізацыйна - масавая работа сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў — бядняцкоў і серадняцкоў.

Цьвёрдыя заданьні з кулацка - заможных гаспадарак спагнаны поўнасьцю.

Партыйная ячэйка і сельсавет НЕ пазбавіны, аднак, супакойцца на дасягнутых посьпехах і мабілізаваць усе сілы на барацьбу за сустрэчны плян.

Р. Г.

5 лютага—перыяд дзень масавага рэйду

НЕ НА СЛОВАХ, А НА СПРАВЕ

рыхтавацца да дэкадніка генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы

КАЛГАСНЫ АКТЫЎ УКЛЮЧЫЎСЯ У ПРАВЕРКУ

РЭЧЫЦА (наш кар.). Брыгады РайКК РСІ і рэдакцыі газэты «Рэчыцкая Праўда» выехалі ў дзевяць сельсаветаў для дапамогі калгасам па праверцы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. У калгасах і сельсаветах створаны пастаянныя брыгады па праверцы падрыхтоўкі да сяўбы з камсамольцаў, рабселькораў і калгаспага актыву. Брыгады прыступілі да праверкі падрыхтаванасьці калгасаў.

Калгасы імя Калініна, імя Дзяржынскага і «Савецкая Беларусь», дзе ўся работа перанесена на зьдзелы пічыну і ліквідавана абязьлічка, добра рыхтуюцца да веснавой сяўбы. У гэтых калгасах ужо адрамантавана большасьць с.-г. машын і прылад.

Разам з гэтым ёсьць такія калгасы, як «Чырвоны партызан», «Шлях сацыялізму», «Ударнік», дзе яшчэ ня створаны насенныя фонды і не абагулена маемасьць.

Да большасьці сельсаветаў і калгасаў яшчэ не даведзены планы веснавой сяўбы.

Новікаў.

Сустрэчны саўгасу № 8

БАРЫСАЎ. Рабочыя і служачыя трусаводчага саўгасу № 8 выступілі сустрэчны плян па правядзеньні веснавой с.-г. кампаніі. Рабочы калектыў абавязаўся здаць дзяржаве 10542 трусы, замест вызначаных паводле пляну 9.872 і скарэціць адыход маладняка да 5 проц.

Зараз саўгас усе сілы пераключыў на падрыхтоўку да веснавой сяўбы—рамантуюцца ўвесь сельска-гаспадарчы інвэнтар і прылады.

Рабочыя і служачыя саўгасу выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы трусаводчы саўгас № 4 Магілёўскага раёну. (Белта).

Масавую праверку не падмяняць фармальнымі пастановамі

МСЬЦІСЛАЎЛЬ (ад нашага спэцкора).

Галоўная задача ўсебеларускага рэйду праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы—мабілізаваць на гэтую справу шырокія масы калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, навярнуць увагу да падыходзячай 3-й бальшавіцкай вясны ўвесь наш апарат, пачынаючы з цэнтральных і канчаючы раённымі і сельскімі калгасна-зямельнымі арганізацыямі.

Мазалоўскі-ж сельсавет такое масавае мерапрыемства, як усебеларускі рэйд, зьвёў да простай фармальнай пастановы. Для таго, каб паказаць, што «мы, вось, робім», сельсавет пастанавіў гэта важнейшае пытаньне на абгаворваньне свайго пленуму ў парадку «інфармацыі».

Пленум, заслухаўшы інфармацыю, прыняў рэзалюцыю і на гэтым справа спынілася. У калгасах ніякай падрыхтоўкі да рэйду не вядзецца. Большасьць калгасаў ня ведае калі праверка будзе праводзіцца.

Старшыня сельсавету на троці дзень ужо забыў пра пасталову пленуму, бо калі ў яго запыталіся, што зроблена ў падрыхтоўцы на правядзеньні рэйду, ён адказаў:

— Як жа-ж, мы кожны дзень праверяем калгасы, з праверкай у нас добра.

На прыёмшчыкам насеньня, а арганізатарам загатовак

ЧЭРВЕНЬ (па тэл. ад нашага спэцкора).

Дзьве дэкады прайшлі з моманту апублікаваньня пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб правядзеньні веснавой с. г. кампаніі 1932 году. Тэрміны выстарчальны для таго, каб сапраўды па-бальшавіцку разгарнуць падрыхтоўку да вясны, мабілізаваць вакол гэтай справы масы калгасьнікаў. Але ў Чэрвеньшчыне ўсё спакойна. Ачыстка збожжа, рамонт с. г. машын, стварэньне насенных і страхавых фондаў —гэтыя вузлавыя зьвёны падрыхтоўкі да сяўбы не прыкавалі да сябе ўвагі райза і райкалгасаюзу. Адсюль гэта ня ведаюць, як фактычна стаіць справа ў калгасах.

Ніякай спрэвяздачнасьці і ўліку падрыхтоўкі да сяўбы не вядзецца.

Загатоўка насеньня траў і коранплодаў, ва ўмовах Чэрвеньскага жывёлагадоўчага району, мае актуальнейшае значэньне, між тым плян загатовак вікі выкананы на 10,1 проц. сэрадалі—3,2 проц. З 215 цэнтн. капюшыны загатоўлена толькі 95 кгр. Слабыя тэмпы загатовак, тлумачацца тым, што кантора Белкалгаснасенсаюзу выступае толькі як прыёмшчык насеньня, а не арганізатар загатовак. Насеньне-ж у раёне ёсьць. Гэта мы бачым па прыкладзе калгасу «Ніўны бор», Вязенскага сельсавету, які замест 7 цэнтн. насеньня здаў 19 цэнтн.

Раённая газэта «Калектывіст», слаба ведзе барацьбу за стварэньне насенных фондаў. Усебеларускі рэйд павінен даць карэнны пералом у падрыхтоўцы да сяўбы па Чэрвеньскім раёне.

Харытончык.

Самацёк у загатоўцы насеньня

ПУХАВІЧЫ. Загатоўка насеньня кармовых траў у Пухавіцкім раёне разгортваецца незадавальнячыя марудныя тэмпамі. На 20 студзеня плян загатовак насеньня вікі выкананы калгасамі на 9 проц., аднаасобнікамі — на 4 проц., па канюшыне — калгасамі — 1,2 проц., аднаасобнікамі — 11,8 проц., па сэрадалі — калгасамі — 0,1 проц., аднаасобнікамі — 3 проц.

Гэтыя лічбы лепш за ўсё паказваюць на самацёк, які панае ў справе загатовак насеньня. Масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў не мабілізаваны.

Чабор.

Раўняцца па Новацюхінскім с-савецце

ДУБРОЎНА. (Белта). Новацюхінскі сельсавет па-баявому рыхтуецца да 3-й бальшавіцкай вясны. Актывам сельсавету дэтальна абгаворыны пляны веснавой кампаніі як на калгасным, так і па аднаасобным сэктары.

Пленум сельсавету, абмяркоўваючы пляны сяўбы, выклікаў на сацыпаборніцтва Чарнаручанскі сельсавет і пастуцных аб'ектах па барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці 100 проц. ачыстка насеньня, максымальная мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў насеньня, каб забясьпечыць насеньнем правядзеньне рамонту с.-г. інвэнтару.

Збожжаачышчальныя машыны на складах Горацкай МТС

ГОРКІ. Горацкая МТС амаль яўсіне разгарнула падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. У калгасах у раёне дзейнасьці МТС трэба адрамантаваць 93 плугоў, 56 бораў, 25 сэяўрак, 13 арэўлў і рад іншых машын, але да рамонту інвэнтару яшчэ ня прыступілі ва. Калгасы не прыманцаваны да паасобных майстэрань.

У выніку ўраўнілаўкі з 208 трактарыстаў, якія працавалі вясной, у МТС зараз засталося 80. На курсах трактарыстаў і мэханікаў з 30 курсантаў засталося 15.

Плян агратэхнічных мерапрыемстваў, як збор попелу, завоз угнаеньня, збожжаачыстка, не распрацаваны. Частка збожжаачышчальных машын ляжыць на складах МТС, другая частка не адрамантавана.

Усебеларускі рэйд павінен арэшыць наперад падрыхтоўку да 3-й бальшавіцкай вясны. МТС павінна стаць па праўдзіным арганізатарам калгасна-творчасьці і базавой падрыхтоўкі калгасаў да сяўбы.

Брыгада РСІ і «Рабселькора»: МАМАЕЎ, НАЙМАРК, МАЛАШЭЎСКІ, ЛАЛОМАЎ, ІОКРОЎ, ЛІТАЎ, ЧАРКІН, ШЭЎЧЫК, БАЛБАТОВІЧ, КАЛІОШКА, ТАРКОЎ.

СЛАБАЯ ПРАЦДЫСЦЫПЛІНА ЗРЫВАЕ РАБОТУ АБМЕННЫХ ПУНКТАЎ І ТАВАРНЫХ СТАНЦЫЙ

Дэкаднік ня даў станоўчых вынікаў

Загад тав. Андрэева аб павялічэньні карыснай работы вагоннага парку ня менш, чым на адну гадзіну ў суткі, на станцыі Магілёў ня выконваецца.

Абвешчаны дэкаднік па паляпшэньні работы абменнага пункту станоўчых вынікаў ня даў. У пляне дэкадніка было намечана шмат пунктаў, напрыклад, да 26/1-32 г. забясьпечыць пункт рабсілай запаснымі часткамі і г. д., аднак, па справе ні адзін пункт ня выканан.

Асноўная прычына дрэннай работы хаваецца ў зусім слабай працдысцыпліне. Вагоны прастойваюць звыш заданай нормы ў сярэднім 3,2 гадзіны ў суткі. Адпраўка цягнікоў паводле раскладу за першыя 20 дзён студзеня складае 95 проц. Каэфіцыэнт манэўровай работы выкананы на 97 проц. У першыя 15 дзён студзеня было адпраўлена 15 цягнікоў з вялікім спазьненьнем, прычым 4 цягнікі па прычыне непадрыхтаванасьці, 3 — па прычыне несвачасовага выкліканьня кандуктарскіх і паравозных брыгад і г. д.

Нядобраякасны рамонт вагонаў паранейшаму займае значнае месца. За першыя 20 дзён студзеня паўторнасьцяй рамонту было 26 выпадкаў і 40 выпадкаў адцэпкі вагонаў у дарозе. Вагоны, якія патрабуюць рамонту, свачасова на рамонтныя шляхі ня ставяцца, а гуляць па тупікох, што ставяцца, а гуляюць па тупікох, што

Тав. РАГАЧЭЎСКІ — лепшы ўдарнік мэханічнага цэху дэпо ст. Менск

нага часу на пошукі.

Канторшчык абменнага пункту тав. Рагачэўскі дакументы афарміляе несвачасова, а таксама робіць няправільныя разметкі на вагонах. З гэтай прычыны вельмі часта вагоны і пляцформы ідуць не па вызначаных маршрутах. 20 студзеня па віне Рагачэўскі пляцформа з будматар'яламі, прызначаная для выгрузкі ў Магілёва, пашла ў Калінавічы.

Канторшчыкі Дамараці і Палякоў таксама сыстэматычна засылаюць не па адрасе кліэнтуры гружаныя вагоны. 24 сьнежня вагон, прызначаны для Магілёва, быў прычэплен да саставу паражняка і накіраван у Ростуў, а 5 студзеня імі былі адпраўлены з паражняком гружаныя вагоны пад № 450819 і 633571.

Мясцком руху станцыі Магілёў, замест жорсткай барацьбы з рвачамі і гультаямі, часамі патурае ім і бярэ пад сваю апеку. Начальнікам станцыі быў зьняты з работы камсамолец Казміраў, як гультай і прагульшчык, а мясцком руху хадайнічаў аб тым, каб пакінуць яго на рабоце. З 1 па 20 студзеня было 67 выпадкаў парушэньня працдысцыпліны. Уся барацьба вядзецца толькі ў адміністрацыйным парадку, без мабілізацыі грамадзкай думкі. Масавая работа па мясцкоме руху зусім не адчуваецца.

Партыйны калектыў станцыі Магілёў павінен зрабіць рашучы пералом у рабоце абменнага пункту і службы руху.

Эпштэйн.

Вынікі безадказнасьці

У сыстэме работы Менскай таварнай станцыі сустрэчныя перавозкі завялі гаматовае месца. Вагоны сыцэц, які вызначан для Магілева, атрымлівае Менск, і наадварот.

Накіраваньне грузаў не па адрасе — звычайнае зьявішча, з якім ніхто не вядзе барацьбы. Весь начальнік абуваючых прыладаў.

Са станцыі Кашыя у адрас скурбазы заводу «Бальшавік» было выслана 19 мешк скуры пробнай рагатай жывёлы, а атрымана скура буйной рагатай жывёлы, якая была вызначана Магілеву.

Другі факт. 13 студзеня база заводу «Бальшавік» атрымала вагон № 5.222-113, у якім быў сырэц зусім не для Менску.

За сьнежань 1931 году скурсырэц базы заводу «Бальшавік» у менскай таварнай станцыі абязьлічана на суму 1.500 руб., а 11 студзеня 1932 году яшчэ дадатковы 34 абязьлічаны месцы скурсырэцу. Дзе крамыка абязьлічкі і хто зьяўляецца вінаватым?

Часта зьдзіўляецца, што на грузаадпраўцелі не наклейваюць бірак (маркі, якія прыклейваюць з кожна пункту ідзе груз і які). Есьць на станцыі Полацак працуе адпраўцель т. Малаякі сыстэматычна адпраўляе сырэц бяз бірак. Але галоўная вінаватасьць абязьлічкі зьяўляецца вагаўшчык менскай таварнай станцыі, як т. т. Каганоўскі, Нікіфараў, Петровіч і іншыя. Яны загадваюць грузчыкам пры выгрузцы скурсырэц класьці ў адну кучу і ніякай увагі не адчаюць правільнаму сартаваньню. Жакет тады калі біркі ёсьць. Вось чаму сырэц, які прызначан для Магілева, застаецца ў Менску, і наадварот. Дрэнная работа менскай таварнай станцыі павялічвае лік сустрэчных перавозак і апрача гэтага стварае ўнутры складу шэрны хаос. З прычыны таго, што скурсырэц пры выгрузцы кладзецца ў адну кучу а іншыя матар'ялы, павялічваецца брак пры выпрацоўцы. Рабочыя і служачыя скурсырэцовай базы «Бальшавік» зьвярнуліся до рабочых-грузчыкаў і вагаўшчыкоў менскай таварнай станцыі з лістом, каб апошнія палепшылі сваю работу.

Трэба дабіцца рашучага пералому ў рабоце выгрузачных аўчыбаў менскай таварнай станцыі.

З. С.

За 86.000 тон таварнага малака

будуць змагацца малочныя фэрмы БССР у чацьвертым, заключным

Малочныя таварныя калгасныя фэрмы БССР закончылі трэці год пяцігодкі са значнымі посьпехамі. На 1 студзеня мы ўжо мелі ў БССР 1.243 малочных фэрмы са стадам у 146.000 штук буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 88.000 дойных кароў. Заданьне партыі і ўраду па кампляктаваньні стада выканана на 113,5 проц.

У 1931 годзе малочныя калгасныя фэрмы здалі (прадалі) дзяржаве 250 тысяч цэнтн. малака, што складае 70 процантаў малочнай прадукцыі ад агрэмаджанай жывёлы ўсяго калгаснага сэктару. Каля 400 перадавых малочных фэрм дасягнулі высокай таварнасьці—70-90 проц. здавага ўдою ў гэтых фэрмах здавалася дзяржаве. Мы маем прыклады высокай удойнасьці кароў на фэрмах.

Падрэсьліваючы гэтыя бясспрэчныя дасягненьні першага году работы малочных фэрм, мы ўсё-ж павінны сказаць, што значная колькасьць фэрм не скарыстаў усіх перавагаў, якія дае арцельная форма гаспадаркі і агрэмаджаньне сродкаў вытворчасьці.

Побач з добрымі паказальнікамі колькасьцяй парадку (колькасьць фэрм і стада) мы назіраем яшчэ нізкую якасьць работы большасьці фэрм.

Два паказальнікі сапраўды могуць характарызаваць пасьпяховасьць работы фэрм — гэта таварнасьць гаспадаркі і ўдойнасьць стада. Гэтыя паказальнікі трэба разглядаць супольна. Есьць фэрмы з высокім удоем. Напрыклад, фэрма «Зьвязда», Пухавіцкага раёну, дзе карова ў сярэднім дае 1.400-1.500 літраў у год, але таварнасьць гэтай фэрмы дасягае ўсяго 40 проц.—пераважная частка прадукцыі ідзе на месцы. З другога боку, ёсьць фэрмы (Буда-Кашалёўскі раён), дзе таварнасьць дасягае 73-80 проц., але гэта таварнасьць складае ўсяго 300 літраў малака ад каровы ў год.

Пры даволі высокай таварнасьці перадавых фэрм (70-90 проц.) у асноўнай масе фэрм таварнасьць не перавышае 50 проц., а рад фэрм здалі дзяржаве ўсяго 20-30 проц. удою. Гэта паказвае, што ў значнай колькасьці калгасаў яшчэ ня зжыты спажывоцка-рвацкія тэндэнцыі адсталай часткі калгасьнікаў.

У перадавых фэрмах удой у сярэднім дасягае 1.700-1.800 літраў ад каровы ў год. Большасьць-жа фэрм мела ў сярэднім 900-1.000 літраў.

Такім чынам, цытаты ўзьняцьця ўдою і таварнасьць зьяўляюцца зараз рашаючымі ў рабоце малочных фэрм БССР.

Зусім зразумела, што асноўным зьнявом у павышэньні ўдою і таварнасьці фэрм зьяўляецца правільная арганізацыя працы. Абязьлічка на фэрмах, пакучасьць брыгад, падзёнічына—вось галоўныя прычыны нізкіх удояў, ялавасьці, значнага процанту аборту, маладняка, дрэннага догляду.

Адсюль галоўная задача у барацьбе за ўдой зьяўляецца падбор і замацаваньне за фэрмай лепшых калгасьнікаў і калгасьніц не на сэзон, а на ўвесь год. Гэтым мы адразу ліквідуем пакучасьць рабочай сілы. Сюды яшчэ трэба дадаць неадкладнае разьмеркаваньне жывёлы па групах і прымацаваньне гэтых груп да поўных калгасьнікаў. Палічэньне працадзён работнікам фэрмы павінна знаходзіцца ў простай залежнасьці ад удояў і прыросту жывой вагі.

Толькі на аснове правільнай арганізацыі працы і аплаты ад адзінкі прадукцыі, ліквідацыі абязьлічкі, разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва мы зможам узьняць удойнасьць кароў.

1.400 літраў удою і 70 проц. таварнасьці—вось лічбы, якія павінны стаць здабыткам шырокай масы работнікаў калгасных фэрм. Толькі пры выкананьні гэтых паказальнікаў малочныя фэрмы Беларусі здадуць дзяржаве вызначаныя планам 86 000 тон таварнага малака.

ГРЫНЕВІЧ.

ПАДЗЕІ НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ

Японская авантура ў Кітаі набывае ўсё больш і больш шырокі размах і становішча, якое ствараецца ёю на Далёкім Усходзе, робіцца ўсё больш і больш пагражаючым. Не задавальняючыся фактычным захватам Манчжурыі, японскі імпэрыялізм імкнецца ў далёку ракі Янцзы. У Шанхаі знаходзяцца значныя сілы японскага ваеннага флёту і японскія, маракі атрымліваюць такім чынам магчымасьць пасьпяліць з японскай сухаземнай арміяй лаўры са «геройчныя ўчынкі» разбойніцкага нападу на Кітай. Японская морская пяхота гураганным агнём абстрэльвае кітайскую частку Шанхаю, Чапей, які да цяперашняга часу ўжо больш чым паўвалоў вытрымае. Дзесяткі тысяч кітайскіх сем'яў зруйнаваны, засталіся без даху і ня маюць магчымасьці вырвацца ад агня японскай артылерыі і японскіх самалётаў, бо адміністрацыя чужаземнага сэтльмэнту, прадбачачы, ужыла меры да таго, каб закрыць доступ туды кітайцам і такім чынам забясьпечыць сябе ад пярэмежасьцяй з боку японскай ваеннічыны.

Аб грандыёзных і зусім выключных разьмерах таго набоішча, якое было зроблена японскай ваеннічынай у кітайскай частцы Шанхаю, можна меркаваць хаця-б тавоце паведамленьню шанхайскага кароспандэнта агенцтва «Рэйтар», якога пяжка западозрыць у асобых сымпатыях да кітайскага насельніцтва. Кароспандэнт «Рэйтара», які асабіста назіраў японскае бамбардаваньне выключна густа населенай і зусім безабаронай кітайскай часткі Шанхаю, адзначае, што «збіваньне двухсот тысяч кітайскага насельніцтва, якому быў закрыт доступ у міжнародны сэтльмэнт, павінна было быць страшэнным. Неба пакрыта густымі хмарамі дыму ад пажараў, якіх ніхто ня тушыць».

Як відома, японскія імпэрыялісты кажаваюць справу ўвесь час такім чынам, як быццам іх адкрыта разбойніцкі напад на Шанхай, разам са знішчэньнем і зруйнаваньнем дзесяткаў тысяч бязьбройных людзей, быў толькі эпізам «абароны» інтарэсаў японскіх рэсыдэнтаў, якія пацярпелі, нібыта, незаконную «страту» з боку кітайскага насельніцтва. Японскія імпэрыялісты надзвычай абураны з нагоды таго анты-японскага руху, які стыхійна выбухнуў у Кітаі і які выявіўся ў байкоце японскіх тавараў, што зьявілася адказам на ўварваньне японскай ваеннічыны ў Манчжурыю. У гэтым ажце самаабароны з боку кітайскага насельніцтва, якое цяпер пачынала пакат супроць волі зрадніцкага каміцанаўскага ўраду, японская ваеннічына ўгледзіла выстрачальную падставу для таго, каб спарадзіць у важнейшых гандлёва-прамысловых пэнтр Кітаю — Шанхай — карную экспэдыцыю з крэйсэраў, авіяносцаў і адпаведных дапаможных ваенна-морскіх сіл.

Адначасова японскі імпэрыялізм працягвае сваю правакацыйную работу і ў паўночнай Манчжурыі.

Ня толькі ў Манчжурыі, але і ў такім першакласным пэнтры белагвардзейскай эміграшчыны, як Парыж, абмяркоўваюцца пляны новай ваеннай авантуры супроць СССР. Зьяўляюцца зноў на сцэну чэхаславацкія генэралы спэцыялісты па частцы міжнародных ваенных авантур і іх прысьпешнікі, абмяркоўваецца плян стварэньня на Далёкім Усходзе белагвардзейскай «буфэрнай дзяржавы» і г. д.

Разьвіцьцё падзей на Далёкім Усходзе сьведчыць аб тым, што мы маем там выключна небясьпечнае становішча, становішча, поўнае надзвычай сур'ёзнай пагрозай вайны.

Японская ваенная авантура ў Кітаі ўзьнікла на фоне жорсткага сусьветнага гаспадарчага крызісу і зьяўляецца адной з форм яго праяўленьня. Падзеі ў Манчжурыі зьяўляюцца выключна красамоўным довадам нябывалай глыбіні абвастрэньня супярэчнасьцяй імпэрыялізму. Японскія імпэрыялісты імкнуцца як мага хутчэй і паўней скарыстаць сьцясьнёнае, з прычыны сусьветнага крызісу, асабліва ў цяперашній крэдытна-валютнай форме яго, становішча сваіх канкурэнтаў па Далёкім Усходзе, Амэрыкі і Англіі, для таго, каб захапіць такія пазыцыі, якія-б далі Японіі магчымасьць у далейшым стаць гегемонам Далёкага Ўсходу.

Надзвычай характэрна пазыцыя, якая займаецца Францыяй. Для Францыі Японія зьяўляецца, па-першае, «жандарам Азіі», г. зн. арганізатарам інтэрвэнцыі супроць кітайскай рэвалюцыі, перамога якой азначала-б для Францыі нагрозу нямінучай страты адной з багацейшых французкіх калёній — Інда-Кітаю. З другога боку, Францыя, інтарэсы якой ва ўласным Кітаі і ў Манчжурыі нязначныя, ахвотна аказвае японскаму імпэрыялізму самае поўнае і безагаворачнае падтрыманьне, аказваючы такім чынам паўны паціск на Англію і ПАЗШ. Францускі імпэрыялізм шантажуе Вашынгтон і Лёндан сваёй палітыкай падтрыманьня японскага імпэрыялізму і разьлічвае шляхам гэтага шантажу дабіцца ўступак ад ПАЗШ і Англіі ў пытаньні аб рэпарацыях і даўгох і ў пытаньні аб «раззбраеньні».

Што датычыць краін фунту і даляру, то яны азіраюцца адна на другую і кожная лічыць за лепшае, каб другая ўвязалася раней у канфлікт з Японіяй. Ня гледзячы на тое, што ўварваньне японскай ваеннічыны ў далёку ракі Янцзы стварае выключна сур'ёзную пагрозу інтарэсам амэрыканскіх і ангельскіх капіталістаў, якія маюць у гэтым раёне буйнейшыя ўкладаньні, і ПАЗШ і Англія ўсё адна застаюцца ў агульным на пазыцыі пасыўнасьці. З аднаго боку, і ў Англіі і ў Амэрыцы не забываюць аб тых магутных фактарах сацыяльнай рэвалюцыі, што ёсьць у Кітаі, і баяцца, каб адкрытая сутычка паміж імпэрыялістамі не паскорыла выбуху рэвалюцыі ў Кітаі, якая палажыла-б канец панаваньню ўсіх імпэрыялістаў. У гэтым сэнсе існуе вядомая «салідарнасьць» паміж усімі імпэрыялістамі.

З другога боку, фінансава-валютны крызіс прымушае і ангельскіх і амэрыканскіх банкіраў баяцца ўсяго таго, што магло-б прывесьці да японскага большага патрасеньня фунту стэрлінгаў або да краху даляра.

У сваёй прамове пры адкрыцьці XVII усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі тав. Молатаў адзначыў, што падзеі на Далёкім Усходзе патрабуюць ад нас сур'ёзнай пільнасьці і належнай гатоўнасьці да нечаканасьцяй з боку ваяўнічых замежных буржуазных колаў.

Ня гледзячы на ўсю тую ўпартасьць і пасьлядоўнасьць, з якімі Савецкі Саюз праводзіць сваю палітыку міра, што адбіваецца, у прыватнасьці, у апошні час у перагаворах аб пактах аб непападзе і ў падпісаньні такіх пактаў з паасобнымі дзяржавамі, ня спыняюцца правакацыі, накіраваныя на зрыў міру, якія сьведчаць аб бязупынным падрыхтоўцы повага нападу на краіну пяцігодкі аз чатыры гады. Савецкі Саюз, ня гледзячы на гэта, будзе ня ўхільна працягваць сваю барацьбу за мір. «Але гэта ня значыць, што мы ня зможам адбіць ахвоты ў імпэрыялістычных клік у выпадку іх нападу на нас» (Каганові ч).

П. Андроўскі.

ЗА ШАНХАЕМ—НАНКІН

БАМБАРДЫРОЎКА НАНКІНУ І СВАТОУ, АКУПАНТЫ РЫХТУЮЦЦА ДА ЗАХВАТУ ДАЛІНЫ ЯНДЗЫ

ШАНХАЙ, 2. Учора ночу японскія судны на Янцзы адкрылі агонь па Нанкіну з мэтай не дапусьціць пераправы кітайскіх войск праз раку паміж Нанкінам і Пукоў. Японскае бамбардаваньне выклікала ў горадзе хаос. Знарадамі разваліны многія будынкі, разбураны вуліцы. Японская артылерыя выпусьціла 20 знарадаў. Напярэдадні бамбардаваньня в Нанкіну паведамлялася, што становішча ў горадзе надзвычай напружанае. Кітайска-японскія войскі стаяць тварам у твар па адным і другім беразе ракі.

Вуліцы Нанкіну запоўнены жыхарамі, якія прабуюць уцячы за межы гарадзкіх сьцен. Кітайскія войскі адбілі першую атаку японцаў з мора. Цяпер яны, чакаючы атакі з сушы, умацоўваюць парты, будуюць акопы і барыкады. Каля варот гарадзкіх сьцен устаноўлены пункты для навосці і рэгуляваньня артылерыйскай стральбы.

Напярэдадні бамбардаваньня Нанкіну японскі генэральны консул у Нанкіне паведаў міністра замежных спраў нанкінскага ўраду Ловень-Кана і ўручыў яму вярбальны пратэст. Японскі консул абвінавачвае кітайскія ўлады ў тым, што яны першыя адкрылі агонь у Шанхаі. Японскі консул патрабаваў, каб у Шанхаі было захавана сучаснае становішча. Аднак, Ловень-Кан прад'явіў патрабаваньне па адпаўленьні нармальнага становішча. Такім чынам нарада японскага консула з міністрам замежных спраў нанкінскага ўраду не дала станоўчых рэзультатаў. (ТАСС).

Генэрал Гайда выехаў у Манчжурыю

ПРАГА. Цыркулюць чуткі, што былы начальнік чэхаславацкага генэральнага штабу Гайда выехаў заграніцу, каб стаць на чале манчжурскіх белагвардзейскіх банд. Друк сьцьвярджае, што Гайда, нібы, скрыўся загранiцу, бо яму прадстаіць адбыць двохмесячнае турэмнае зьняволеньне, да якога ён быў прысуджаны яшчэ ў 1929 годзе. (ТАСС).

Ваенныя сілы імпэрыялістаў у Шанхаі

ЛЕНДАН, 31. У Шанхаі знаходзяцца наступныя ваенныя судны: 9 амэрыканскіх, 5 французскіх, 3 італьянскіх і 30 японскіх; колькасьцю войск ангельскія складаюць 2.270 чалавек, амэрыканскія — 1.206, французкія — 1.030, японскія — 4.000 маракоў, ня лічачы войск на караблях колькасьць якіх невядома. Колькасьць японскіх войск акрэсьліваецца ў 25.000 чалавек; в Гонконгу накіравана ў Шанхай яшчэ 2.000 чалавек.

Бамбардыроўка Сватоу

ШАНХАЙ. Кітайскія газэты публікуюць паведамленьне з Кантону аб тым, што японскія маракі высадзіліся ў Сватоу (буйнейшы порт правінцыі Гуандунь) і адкрылі страляніну па кітайцах. Далей паведамляецца, што японскі консул у Сватоу прад'явіў патрабаваньні кітайскім уладам і вызначыў тэрмін адказу, які канчаецца сёньня. Падрабязнасьці яшчэ невядомы.

130 японскіх бамбавозаў у Шанхаі

ШАНХАЙ, 2. У Шанхай прыбыло дадаткова 44 японскія бамбавозы. Сёньня чакаецца прыбыцьцё яшчэ 46 бамбавозаў. У агульнай складасьці колькасьць японскіх ваенных аэраплянаў у Шанхаі дасягае 130 адзінак. У далейшых ваенных дзеяньнях супроць кітайцаў, якія чакаюцца ў бліжэйшы час, японская пяхота будзе падтрымлівацца паветранымі сіламі.

Японскі аэраплян над Бэйпінам

БЭЙПІН, 2. Учора над японскай ваеннай місіяй у Бэйпіне зьявіўся японскі аэраплян, які скінуў пакеты. Місія давала інфармацыі сьпачаламі. Група кітайскіх салдат прабавала абстраляць аэраплян, але японскія афіцэры місіі адкрылі ружэйны агонь і разагналі кітайскіх салдат.

У ЖЭНЭВУ ПРЫЕДЗЕ КАЛЯ 1.260 АФІЦЫЯЛЬНЫХ ДЭЛЕГАТАЎ

БЭРЛІН, 26. Паводле вестак з Жэнэвы, дэлегацыі паасобных краін прыедуць на канфэрэнцыю па разьбраеньні з вялікарымі тэхнічнымі штатамі. У Жэнэве ўсяго будзе прысутнічаць каля 1.260 афіцыяльных дэлегатаў. Самай вялікай будзе італьянская дэлегацыя ў складзе 160 чалавек. За ёю ідзе японская ў складзе 130 чал., ангельская — у 140 дэлегатаў і француская — з 120 дэлегатамі, Германія і ПАЗШ пасылаюць па 70 дэлегатаў, Польшча і Румынія па 40 і іншыя краіны — па 16-20. Апрача таго, на канфэрэнцыю чакаюць 600 журналістаў, некалькі соцень членаў парламентаў і прадстаўнікоў розных арганізацый. (ТАСС).

Француская пазыка Японіі на вядзеньне вайны

БЭРЛІН. 25. Левая рабочая газэта «Нойе Монтагсцэйтунг» паведамляе з Парыжу, што паводле сапраўдных вестак, Францыя нядаўна прадаставіла Японіі пазыку ў 800 млн. франкаў. Большая яе частка — каля 80 проц. Японіяй выкарыстана на заказы францускай ваеннай прамысловасьці.

Паводле паведамленьня газэты ў прадастаўленьні пазыкі адыгрывалі вялікую ролю антыкавецкія фінансавыя і ваенныя колы Францыі. За апошнія тры месяцы, указвае газэта, вядомыя буйныя ваенныя заводы Шэйдэр Крэзо працуюць бесьперабойна ў тры зьмены, прычым на іх занята зараз 55 тыс. рабочых.

Новы камдэпутат польскага сойму

ВАРШАВА, 27. На месца выбраных суду камуністычных дэпутатаў сойму т. т. Бужыньскага і Данецкага, з ураінскага дня ў склад сойму ўвайшоў пакуль адзін новы камдэпутат Розэнбэрг Халь, яўрэйскі рабочы, ткач з Лодзі.

Папраўка

У «Зьвязьзе» ад 1 лютага з-за дрэннай перадачы па радыё з Масквы склад кіруючых органаў XVII партканфэрэнцыі падрукаваны няпоўнасьцю. Прапушчаны прозьвішчы абраных у прэзыдыум т. т. Варачыньскага, Баўмана і Косарва; у рэдакцыйную камісію — Ханджан і Вагера.

Паведамленьні

— Менгарком КП(б)Б склікае народу прапагандыстаў вытворчых ячэек КП(б)Б на пытаньні становішча партасьветы. Парадак дня: 1) Інфармацыя прапагандыстаў аб становішчы партасьветы. 2) Бягучыя справы. Нарада адбудзецца 4/II-32 г. у 11 гадз. раніцы, у памяшк. Культурпону гаркому (пакой № 14). Усім прапагандыстам зьявіцца да вызначанага тэрміну без спазьненьня, а таксама падрыхтавацца да інфармацыі наступным прапагандыстам: Мазноў (цягна), Тарарай (зав. «Бальшавік»), Брэгман (ф-ка «Камунарка»), Добрадзей (шчотачная ф-ка), Авербах (Мосбуд), Брук («Касцярнік»), Рубінштэйн (друк імя Сталіна).

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 10/II-32 г. у м. Талочыне будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынёвам тав. Гофштэйна па разглядзе наступных апэляцыйных спраў: Шабека Піліпа Вас., Машкарова В. С., Камароўскага, Гардзеева Л. Р., Казакопая К., Шарпілы Піліпа (Талоч. р.), Чаўсава І. С., Хайкіна К. К., Іванцова Д. М., Заліна І. Е., Серыкава С. І. (Дубров. р.), Аляксеенка В. А., Падкапаева С. М., Маласая З. А., Макаревіча Я. А. (Крупскі р.), Макара Адольфа (б. Халопен. р.). Яўка вышэйпазначаных т. т. на пасяджэньне ПТ ЦКК КП(б)Б абавязкова. Праезд за свой кошт.

Адказны рэдактар М. ТАРЫН.

„БАСТЫЁН КУЛЬТУРЫ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ НА ЎСХОДЗЕ"

Ва ўсіх сваіх урачыстых і праграмных выступленьнях на старонках усёй сваёй прэсы польскія фашысты любяць хваліцца тым, што сучасная Польшча зьяўляецца «бастыёнам заходня-эўрапэйскай культуры», які мяжуецца з «барбарскім Усходам». Кожны дзень, вядучы пры актыўнай дапамозе сацыял-фашыстаў і беларускіх нацыянал-фашыстаў разьюшанае цкаваньне Савецкай Беларусі, польскі фашызм любіць умоцнена падкрэсьліваць сваю «гістарычную місію» ў справе культурнага пацяпьцца народаў, якія насяляюць так званыя «крэсы».

Акупанты з асаблівай зацятасьцю імкнуцца ўзьвесьці пяклёп на нацыянальную палітыку БП(б)Б. Сыстэматычна пускаюцца ў ход выдумкі аб прасьледваньнях беларускай культуры ў БССР, аб зачыненьні беларускіх школ аб прасьледваньні беларускай мовы і г. д. Робіцца гэта тым больш актыўна, чым вастрэй распраўляецца фашызм з беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам на Зах. Беларусі і чым мацней бідзе напэрад магутны рост кнт беларускай пралетарскай культуры ў БССР.

Нядаўна выйшла ў Вільні кніжачка аднаго яўрэйскага культурнага дзеяча аб становішчы яўрэйскай школьнай справы ў Польшчы. У гэтай кнізе прыводзіцца рад цікавых лічбаў і з галіны становішча беларускай школьнай справы ў Польшчы. Усім вядома тая палітыка палёнізацыі, якую праводзіць польскі ўрад у Заходняй Беларусі. Усім вядомы тыя нагромы, якія ўчыняе польскі ўрад над апошнімі рэшткамі беларускіх школ на Зах. Беларусі. Але пара прыведзеных у паказанай кніжцы лічбаў усё-ж пастолькі яркія, што польга іх тут ня прывесьці для ілюстрацыі таго, што робіцца ў фашысцкай краіне.

Толькі 1,25 проц. беларускіх дзяцей на Зах. Беларусі вучыцца на сваёй роднай мове. Адзін і дваццаць пяць сотых процанта! Вось «заваяваньні» ў галіне культуры і цывілізацыі, аб якой так многа піпуць і гавораць фашысцкія паны ў Польшчы! Вось лічба, якая найбольш яркa гаворыць аб тым, якую «нацыянальную палітыку» праводзіць польскі фашызм!

Яшчэ адна лічба. Паводле вылічэньняў паказанай кніжкі на 100 вучняў у Польшчы — 67 палякаў і 33 дзяцей прыгнечаных народаў. З 33-х вучняў нацыянальнай нацыянальнасьці толькі 5 з пал. вучыцца на сваёй роднай мове. У гэтых 5 з пал. проц. уваходзяць і беларусы, і украінцы, і літоўцы, і яўрэі. Вось другая лічба, якая зьяўляецца лепшай ілюстрацыяй тэй палітыкі бязьмернага нацыянальнага прыгнечаньня, якую праводзіць польскі фашызм. З дня ў дзень акупанты грамяць арганізацыі нацыянальна-вызваленчага руху, разбураюць нацыянальныя школы, забараняюць вучыцца і гаварыць на сваёй роднай мове, пагражаюць гарэцы і вёскі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны атрадамі карных экспэдыцый.

Нядаўнае закрыцьцё ў Вільні і Віленшчыне 10 літоўскіх школ у сувязі з абвінавачаньнем вучняў гэтых школ у нацыянальна-вызваленчай барацьбе, зьяўляецца надзвычай паказальным для сутнасьці нацыянальнай палітыкі польскіх акупантаў. Гэты ўдар па літоўскіх народных масах зьяўляецца спробай разгрэміць літоўскі нацыянальна-вызваленчы рух у раёнах Віленшчыны, які расьце і мацнее разам з беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам, пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе камуністычнай партыі.

Зусім ясна, што гэта палітыка польскага фашызму ня толькі ня здольна разгрэміць нацыянальна-вызваленчую барацьбу прыгнечаных народаў, але яшчэ больш завастрае яе. Р.

Грамада і абарона СССР

«Грамада» зьяўлялася тэй масавай арганізацыяй нацыянальна - вызваленчага руху Заходняй Беларусі, якая не магла прайсьці міма такога існуючага пытаньня для нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, як пытаньне адносін да Савецкай Беларусі, не магла ня выявіць сваіх адносін да становішча рабочых і селян на той бок мяжы.

Відома, што пераважная большасьць кіраўнікоў «Грамады» раней зьяўлялася згодніками ў адносінах да польскага ўраду, а некаторыя нават такці ішкі пры сваёй нацыяналістычнай ідэалёгіі, акутаныя нацыяналістычным дурманам, актыўна змагаліся супроць савецкай улады на Беларусі ў 1918-20 г. г.

Але БССР, супроць якой яны змагаліся, хутка расла і замацоўвалася. Ленінскай нацыянальнай палітыкі на справе ператварыліся ў жыцьцё. Аснову лёзунг права на самавызначэньне раней прыгнечаных народаў аж да адарваньня ажыцьцяўся на справе і Савецкая Беларусь зрабілася сапраўды незалежнай ад імпэрыялістычных дзяржаў і знаходзіцца ў цесным брацкім саюзе з іншымі народамі, прыгнечанымі раней царызмам. Яна пры іх дапамозе стала адбудоўваць сваю гаспадарку, будаваць беларускую пралетарскую культуру, шпаркімі крокамі ліквідаваць сваю эканамічную адсталасьць і эканамічна раўняцца да іншых савецкіх рэспублік.

У той час, калі Савецкая Беларусь расла і ўзбуйнялася, па Заходняй Беларусі акупанты не прызнавалі беларусаў за існуючую нацыю, калі ў БССР стваралася сацыялістычная беларуская культура, разьвівалася шырокая сетка школьніцтва і навуковых устаноў, дык на Заходняй Беларусі зьнішчаліся ўсе рэшткі беларускага школьніцтва, якое было здабыта працоўнымі ў перыяд нямецкай акупацыі і ў барацьбе з белапольскімі акупантамі, дайшоўшы да вышэйшага росквіту ў перыяд знаходжаньня на Заходняй Беларусі Чырвонай арміі. Працоўныя Зах. Беларусі не прымірыліся з тым, што іх гваллам адарваны ад іх братоў па клясе польскія імпэрыялістычныя акупанты. Доўга ашчэ пасьля польска - савецкай вайны, амаль да Грамадаўскага перыяду, працоўныя вялі ар'ергарныя баі з акупантамі за права ЗБ па самавызначэньне аж да адарваньня ад Польшчы і ўстанаўленьня такога-ж ладу, які існуе ў БССР.

Пад націскам узрастаючага масавага рэвалюцыйнага руху на ЗБ, а таксама завастрэньня клясавай барацьбы ва ўсёй Польшчы, пры агульным узмацненьні кіраўнічай ролі камуністычнай партыі, як адзінага сапраўднага кіраўніка сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня ўсіх працоўных, — лепшыя дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэнчага руху, шчыра аддаўшы справе народных мас, пайшлі бліжэй сьпяніць свой фронт у адносінах да БССР.

Сьпіратыя прыгнечаных працоўных Заходняй Беларусі да Савецкай Беларусі, якая шпарка адбудоўвала гаспадарку і пачынала дабрабыт асноўных мас насельніцтва, былі настолькі вялікія, што народна прымушалі цяперашніх беларускіх нацыянал - фашыстаў на час мяняць фронт, манэўраваць, каб не застацца за бортам ад мас, а змагацца за перакладзеньне кіраўніцтва нацыянальна - вызваленчым рухам, каб яго затым здрадзіць.

Яшчэ да майскага перавароту ў перадавой газэце «На прадвесьні» ад 25/II 1926 г. ніхто інны, як сучасны правадыр нацыянал - фашызму Луцкевіч пісаў:

«На Ўсходзе пачалася новая эра ў нацыянальным пытаньні. І ідзе беларускага дзяржаўнага будаўніцтва, якую патаптаў «дэмакратычны» Захад, пачала рэалізавацца на Ўсходзе... Там толькі праз сацыялістычнае вызваленьне перад беларусамі адкрылася магчымасьць дзяржаўнага будаўніцтва. Там — і толькі там — беларуская дзяржаўнасьць сталася зьдзейсьненым фактам».

Нават і ў беларускай хадэцыі — прадстаўніка беларускай буржуазіі і кулацтва раздаваліся такія-ж галасы. Прыкладнаўчы зман польскіх імпэрыялістаў, паказваючы на нацыянальны ўцюк, самаволю акупантаў, якія не дапускалі да ўрадавага і самаўрадавага карыта беларускіх паноў і кулакоў, яны таварылі:

«А ў Менску, адкінуўшы ўсе недамаганьні беларускага жыцьця, як жа многа робіцца і добрага. Беларускія школы, беларускі унівэрсытэт, беларускае выдавецтва, беларускі тэатр — на якія хваробы яны не хварэлі, — усё-ж зьяўляюцца цаглінамі і каменьнямі пад самастойны быт Беларусі». («Беларуская крыніца», 25/II-1926 г.).

Вядомая рэч, што сярод гэтай часткі нацыянал - дэмакратычных элементаў — прадстаўнікоў буржуазнай ідэалёгіі ня было сапраўдных сымпатый да Савецкай Беларусі. У сувязі з увядзеньнем НЭП'у у іх пачалі ўзьнікаць надзеі на мірнае буржуазнае перараджэньне Савецкай Беларусі, на шлях яе капіталістычнага разьвіцьця. А ў гэты час акупацкая палітыка грабежу сялянскай зямлі, асадніцтва, вялікія падаткі, ціск і прасьледаваньне беларускай мовы, экстэрмінацыйная палітыка ў адносінах да працоўных беларускіх мас гораду і вёскі, шматныя адносіны да беларускага кулацтва і беларускай буржуазіі, чым да польскіх, выклікалі с боку апошніх часткова і апасьцыйныя настроі да акупантаў.

Але як паказала гісторыя «Грамады» Луцкевіч і К° да канца засталіся разам з польскім імпэрыялізмам супроць Савецкага Саюзу. Толькі пераважная частка беларускай працоўнай інтэлігэнцыі на чале з паслом Тарашкевічам сапраўды павярнула на іншы пратлегны шлях рабочых і сялян. Ад імя грамадаўскай групы пасол Тарашкевіч у сойме заявіў:

«Мы прышлі ў гэты сойм змагацца за аўтаномію... Вось мы хацелі ісьці гэтым шляхам, мы мелі такія імозіі, але... мы сьвяла пэвіны, руйнуючы ўсе гэтыя сэдзіцкія імозіі сказаць нашаму народу, што там, дзе пануе буржуазія, дзе пануюць абшарнікі, яны пануюць ва ўсім краі, там ня можа быць вызваленьня». («Беларуская Доля» № 31 6/IV-1926 г.).

Яны пераконваюцца, што толькі на руінах буржуазна - дэмакратычнай Польшчы можа наступіць нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне Зах. Беларусі, што толькі рэвалюцыйнай барацьбой працоўных мас гораду і вёскі пад гегемоніяй рабочай клясы і кіраўніцтвам яе кампартыі магчыма поўная перамога над акупантамі.

Такім парадкам гэтыя нацыяналістычныя элементы паступова разьвейваюць свой нацыяналістычны дурман і мяняюць свой ягоцінцкі шлях на шлях барацьбы з акупацыяй супроць улады капіталістаў і абшарнікаў. Зразумела, што гэты паварот сярод былых правадыроў «Грамады» адбываецца не бяз хістаньняў. Але чым далей, тым цьвярдзей яны становяцца на грунт бескампрамісная барацьбы з акупантамі, у абарону СССР.

СССР і Савецкая Беларусь настолькі сталі папулярнымі сярод мас Зах. Беларусі, што ўсе ўзрокі працоўных былі пакіраваны ў гэты бок, усе сымпатыі знаходзіліся на баку Савецкага Саюзу. Грамадаўскія газэты амаль ніколі ня выходзілі без асобнага аддзелу хронікі і прагляду прэсы аб Савецкім Саюзе і Савецкай Беларусі. Праўда, часьцей усяго падаваліся толькі голыя цытаты з газэт, бо стрымліваў цэнзуры намордник.

Яшчэ больш пераконвае кіраўнікоў «Грамады» аб магутнасьці і росьце Савецкай Беларусі, аб паляпшэньні ўмоў быту працоўных Савецкай Беларусі, калі частка з паслоў пабывалі ў Савецкім Саюзе ў пачатку 1926 г.

У «Беларускай справе» яны пісалі:

«Вырашэньне нацыянальнага пытаньня ў межах БССР ідзе правільным шляхам. Такая пастаноўка пытаньня справядліва трактуе кожную нацыянальнасьць на беларускай зямлі: дзяржаўнымі прызнаны чатыры мовы — беларуская, яўрэйская, расійская і польская».

У гэты час у фашысцкай Польшчы нарастаў гаспадарчы крызіс, а на яго базе рос і пашыраўся рэвалюцыйны рух рабочых і сялян пад кіраўніцтвам кампартыі. Буржуазія ўзьняла шалёную кампанію супроць Савецкага Саюзу, каб ачарніць яго ў вачох шырокіх працоўных мас, сярод якіх усё больш расьлі сымпатыі да Савецкага Саюзу. Нацыянальна - вызваленчы рух прымаў награжаючыя разьмеры для польска - капіталістычнай акупацыі. Польская буржуазія ачмёх і мячом душыла гэты рух, узмоцненымі тэмпамі, падрыхтоўваючы напад на СССР.

«Грамада» актыўна выступала ў абарону Савецкага Саюзу, яна змагалася з ППС, з беларускай хадэцыяй і Сялянскім Саюзам.

Хлусьні буржуазнай сацыял і нацыянал-дэмакратычнай прэсы «Грамада» скрозь і ўсюды пропісталяла факты становішча ў Савецкім Саюзе і на Зах. Беларусі. «Грамада» бачыла, што хоць паміж паасобнымі групамі пануючай буржуазіі і іх ідэолёгаў і ёсьць трошкі, але ў душаны рэвалюцыйнага нацыянальна - вызваленчага руху і ў пытаньні ўзброенага нападу на СССР у іх разыходжаньняў ня было. Выступаючы супроць ППС, пасол Валошын сказаў:

«Эндэкі кіраваліся засадамі яўнапрабежна - заборчымі, а ППС маскавала свой заборчы апэтыт у адносінах да нашых зямель фэдэральным зваротам. А фактычна ППС была варта НД... Доказам гэтага — крывадушная, нібы прыязная дзейнасьць ППС у адносінах беларускага і украінскага народу, з якіх ППС хоча зрабіць «фарпосты» супроць саюзу сацыялістычных радавых рэспублік, міма таго, што іменна там, у рамах гэтага саюзу нашы народы маюць поўную свабоду і творацъ уласныя радавыя рэспублікі — Беларускую і Украінскую».

Гэта былі словы супроць саюзнікаў-акупантаў—ППС, у абарону Савецкага Саюзу ішчэ далёка да майскага фашысцкага перавароту Пілсудзкага.

Па другі-ж дзень пасьля майскага перавароту, Тарашкевіч у сойме ад імя Беларускага сялянска - работніцкага клюбу гэтак выявіў становішча «Грамады» да фашысцкага ўраду і яго імпэрыялістычных антысавецкіх плянаў:

«Грунт пасьля майскага перавароту не зрабіўся больш цьвёрдым, але зрабіўся больш клэйным. Польшча прысьпешаным тэмпам ідзе да сацыяльнай рэвалюцыі... Калі Польшча дастане пазыку, то накіруе яе не на адбудову сваёй гаспадаркі, як такой, а толькі палітычную пазыку, — пазыку, якая запэўніць Англію, што Польшча разам з яе іншымі новаздабытымі васаламі стане ў супольным фронце супроць Савецкага Саюзу».

Працоўныя ЗБ, цьвёрда стоячы на грунце абароны Савецкага Саюзу, гатовы ў кожную хвіліну грудзьмі стаяць у яго абарону. Але гэта не перапяджала асобным кіраўніком «Грамады» часам хістацца ў гэтым пытаньні. Некаторыя з іх пезаўсёды, даволі грунтоўна і да канца абвяргалі ўвесь пяклёп на Савецкі Саюз з боку клясава-варожых сіл пралетарыяту. Яны часам выказвалі элементы хістаньня ў бок нацыянал - дэмакратызму, што натуральна вынывала з іх клясавай пазіцыі, г. зн. пераважна серадняцкага складу «Грамады» і пяжыцьця да канца сваёй нацыяналістычнай ідэалёгіі. Яны падаваліся часамі палітыку буржуазных нацыянал - дэмакратычных элементаў, якія прымазаліся на даным этапе да нацыянальна-вызваленчага руху, з мэтаю ўзрываць яго зьнутры, або аўладаць ім.

Наогул Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада стаяла на грунце актыўнай абароны Савецкага Саюзу і Савецкай Беларусі. Яна была супроць імпэрыялістычнага нападу на СССР. БССР для «Грамады» зьяўлялася ўзорам, яе пройдзены шлях вызваленьня зьяўляўся шляхам «Грамады», хаця гэты шлях пралетаўляўся кіраўніком «Грамады» яшчэ досыць імгліста.

Фашысцкая дыктатура Пілсудзкага, дыктатура падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу добра гэта бачыла. «Грамада» зьяўлялася для фашысцкай дыктатуры на яе шляху імпэрыялістычных імпэтэньняў, нібы косткай у горле на самым шляцьдарме. Таму фашысцкая дыктатура агнём і мячом разграміла Беларускую Сялянска - Работніцкую Грамаду, каб ачысьціць гэты шляцьдарм. Але фашысцкай дыктатуры не ўдалося зьнішчыць імкненьні рабочых і сялян, лёзунгі якіх красаваліся на чырвоных сьцягах нацыянальна - вызваленчай арганізацыі — «Грамады».

Душачы «Грамаду», душачы нацыянальна - вызваленчы рух, фашысцкая дыктатура вусцамі віленскага «Слова» ад 23 сакавіка 1927 г. гаварыла што:

«шырокае вырашэньне беларускага пытаньня магчыма толькі тады, калі мы будзем зьпадаць Менскам і Магілевам»... «І калі... знайшлася-б група беларускай моладзі ў сапраўднасьці шчыра антыбальшэвіцкая, якая-б верыла ў тое, што іх родная зямля акупавана бальшэвіцкім урадам, то па нашай думцы польская грамадзянасьць і нават урад, у межах абавязуючых нас у міжнародных абавязацельствах — павінны аказаць гэтай групе падтрыманьне».

І такую групу саюзнікаў сваіх імпэрыялістычных мэтаў, польскі імпэрыялізм знайшоў у абліччы беларускіх нацыянал - фашыстаў Луцкевічаў, Астроўскіх і К°, якія палкам сталі на грунт польскага імпэрыялізму пасьля разгрому «БОРТ».

Але сапраўдныя пасьлядоўнікі «Грамады», — «Змаганьне» далей па-рэвалюцыйнаму павяло барацьбу супроць польскай акупацыі, яе імпэрыялістычных плянаў — у абарону СССР. Гэта арганізацыя нацыянальна - вызваленчага руху пасьля «Грамады» з усёй жорсткасьцю таксама была ліквідавана польскімі акупантамі, а лепшыя яе прадстаўнікі кінуты ў турмы на шмат год. На прапісе «Змаганьня», які адбыўся год таму назад, гэтыя пасьлядоўнікі «Грамады» заявілі сноў, што:

«ня выйдуць з рэвалюцыйнага шляху, а абвінавачаны Крынчык проста заявіў, што бароніць Савецкую Расію ад нападу з боку імпэрыялістычных дзяржаў, вайны не спужаюцца, бо змогуць яе ператварыць у сацыяльную рэвалюцыю, якая дасьць працоўнаму народу вопыт, здабытую ўжо ў Савецкай Расіі». («Газэта Варшавска» ад 15/I-31 г.).

Ня гледзячы на ўсе мерапрыемствы фашысцкай дыктатуры, каб задушыць рэвалюцыйны нацыянальна - вызваленчы рух на Заходняй Беларусі, каб расчысьціць сабе шляцьдарм для нападу на Савецкую Беларусь, гэты рух усё больш узмацняецца і набіцьць яркі клясавы характэр, супроць акупантаў, за права Заходняй Беларусі на самавызначэньне аж да адарваньня ад Польшчы ў абарону СССР. Ні нарыя экспэдыцыі, ні палявыя суды, ні высяленьне рэвалюцыйных элементаў з Заходняй Беларусі ня могуць устрымаць размаху надыходзячых рашучых баёў супроць фашысцкай дыктатуры, ня змогуць устрымаць размаху нацыянальна - вызваленчага руху, які ідзе пад гегемоніяй пралетарыяту і кіраўніцтвам яго авангарду — камуністычнай партыі.

Г.

АНОНС! РЫХТУЕЦЦА ДА ПАСТАНОЎКІ АНОНС!
НОВЫ ВЫ